НЕ ЗАБЫТЬ ВЕРНУТЬ ГАЗЕТЫ ЧАСА
БОЛЕЕ ... ПОЛЬЗОВАНИЯ ... ПОДПИСЧИКУ

Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся! | Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się! | Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ ... РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

18 красавіка 1931 г.
№ 89 (3177)

"Савецкая Беларусь" ... Маховая, В Публичной библиотеке СССР им. Ленина ... экз.

Вурокі сьмілавіцкай справы

Сыгналы, якія былі паданы цэнтральным друкам аб фактах зажыму сама крытыкі, прасьледваньні рабселькораў, правапартыстыцкім скажэньні л'ніі партыі, «левацкіх» загібах, адміністраваньні, што мела месца ў Сьмілавіцкім раёне—гэтыя сыгналы зьявіліся правільнымі і своячасовымі. Факты, якія былі зьмешчаны на старонках друку, поўнасьцю сьцьверджаны.

У сваёй пастанове, якая зьмяшчаецца ў сёньняшнім нумары нашае газэты, Сакратарыят ЦК і Прэзыдыум ЦККК КП(б)Б робячы арганізацыйныя выводы бязумоўна далі правільную палітычную ацэнку гэтай справе. Факты скажэньня л'ніі партыі, якія мелі месца ў Сьмілавіцкім раёне, змаглі зьявіцца толькі ў выніку адсутнасьці раз'яснутай бальшавіцкай самакрытыкі, ігнараваньню пастаноў партыі па рабоце сярод беднаты, у яўным замыканьні і патураньні кулаку з боку раду партыйцаў, слабай мабілізацыяй партыйнай арганізацыі на барацьбу супроць кулака і яго агентуры— правых і «левых» апартуністаў.

У выніку слабога наступленьня на кулака, адсутнасьці работы з беднатой, прыступленьня, у паасобных выпадках, клясавай чуласьці, няўменьня разабрацца ў абставінах абвостранай клясавай барацьбы—усё гэта скарыстаў клясава-варожы элемэнт у барацьбе супроць важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы.

Адсутнасьць належнага кіраўніцтва калгасным рухам прывяло да таго, што ў радзе калгасаў кулацкі элемэнт і «былыя людзі» карыстаючыся слабым кіраўніцтвам і адсутнасьцю клясавай пільнасьці з боку партыйных ячэек, праніклі ў калгасы, пачалі разлагаць іх зьнутры.

Сакратарыят ЦК і Прэзыдыум ЦККК КП(б)Б у сваёй пастанове прапануюць «Сьмілавіцкаму РК і РКК правесьці неадкладную работу па растлумачэньні партыйнай арганізацыі, рабочым, калгасным, батрацка-бядняцкім і середняцкім масам сутнасьці гэтых спраў і прынятых па іх рашэньняў, мабілізуючы іх пад кіраўніцтвам парт арганізацыі на рашучае змаганьне з кулаком, зламаўшы яго супраціўленьне, на ачыстку калгасаў ад кулацка-заможных і чужых элемэнтаў, арганізацыі новага прыліву ў калгасы. Паставіць у асяродку ўвагі задачу мабілізацыі ўсіх зьвеньняў раёнаў на правядзеньне веснавой сяўбы, на поўную ліквідацыю прарываў у гаспадарча-палітычных кампаніях».

Трэці рашаючы год пяцігодкі патрабуе ўдарных бальшавіцкіх тэмпаў работы, клясавай пільнасьці. Гэтыя тэмпы могуць быць забясьпечаны толькі шляхам бязьлітаснай барацьбы з кулаком і яго агентурай — апартуністамі ўсіх колераў, шляхам пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня генэральнай л'ніі партыі, шляхам барацьбы за ленінскую нацыянальную палітыку. Вось чаму Сакратарыят ЦК і Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове Сьмілавіцкай арганізацыі прапануюць «рашуча пасьлядоўна барацьбу з правым апартунізмам— галоўнай небясьпекай, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай л'ніі партыі, узмоцніць барацьбу з усякімі скажэньнямі нацпалітыкі партыі, асабліва з вялікадзяржаўным шавінізмам, як найбольш небясьпечным,—з нацыянал-дэмакратызмам, антысэмітызмам і іншымі шавінізмамі, забясьпечыць пасяленьне тэмпаў беларусізацыі і ачыстку культурна - асьветных і навучальных устаноў ад чужых элемэнтаў».

Гэтую дырэктыву партыі павінна зразумець уся Сьмілавіцкая арганізацыя, кожны яе член у паасобку. Вакол выкананьня гэтай дырэктывы павінна быць мабілізавана ўся партыйная арганізацыя.

Але было-б памылкова лічыць, што сьмілавіцкая справа зьяўляецца толькі справай Сьмілавіцкай партарганізацыі. Гэта справа павінна паслужыць вурокам, яна павінна зьяўляцца папярэджаньнем для раду іншых раёнаў.

Сьмілавіцкая справа зьяўляецца так сама вурокам і для нашага друку. Грубая палітычная памылка, зробленая рэдакцыяй газэты «Чырвоная Зьмена» ў дачыненьні да дуйорскай справы, павінна быць улічана ўсім цэнтральным і мясцовым друкам.

Разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі зьяўляецца аднэй з асноўных прадпасылак пасьпяховай барацьбы з усімі перашкодамі на шляху сацыялістычнага будаўніцтва. Вось чаму ўсякім спробам зажыму самакрытыкі павінен давацца бязьлітасны адпор.

У барацьбе за генэральную л'нію партыі друк зьяўляецца **«самай вострай, самай моцнай зброяй нашае партыі» (Сталін).**

Сьмілавіцкая партыйная арганізацыя павінна неадкладна выправіць дапушчаныя ёю палітычныя памылкі, бязьлітсна, па-бальшавіцку выкананць на стаиову Сакратарыяту ЦК і Прэзыдыуму ЦККК КП(б)Б, рашуча змагацца, за ажыцьцяўленьне генэральнай л'ніі партыі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Вурокі сьмілавіцкай справы павінны ўлічыць усе раённыя партыйныя арганізацыі.

Мабілізаваць увагу працоўных вакол пытаньняў малаканарыхтовак

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб нарыхтоўках і кантрактацыі малака і масла

1. Сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае, што зрыў малака і масла-нарыхтовак (выкананьне па Белмалакожывёлаводсаюзу на 2,5 проц., Белкаапсаюзу на 1 проц.) і кантрактацыі (па Белмалакосаюзу на 60,6 проц., па Белкаапсаюзу на 44 проц.), тлумачыцца слабым кіраўніцтвам Наркамснабу БССР, бязьдзейнасьцю нарыхтоўчых арганізацый, маруднасьцю па арганізацыі малочна - таварных фэрм і адсутнасьцю ўвагі да малаканарыхтовак з боку партыйных арганізацый раёнаў.

2. Давядзеньне цьвёрдых заданьняў кулацка - заможным гаспадаркам па Белмалочжывёлсаюзу толькі на 31 проц. і Белкаапсаюзу на 11,9 проц. сьведчыць аб яўна апартуністычнай практыцы раду савецкіх і нарыхтоўчых арганізацый. ЦК прапануе Райвыканкомам і нарыхтоўчым арганізацыям безадкладна давесьці цьвёрдыя заданьні па малаканарыхтоўках кулацка-заможным гаспадаркам і прасачыць за прынятымі мерамі па поўнай здачы ў тэрмін імі малака.

3. Прапанаваць НКС зараз-жа выпрацаваць дадзеныя раней дырэктывы па кантрактацыі і малаканарыхтоўкам кіруючыся дырэктывай НКС СССР ад 8-I 1931 г.

4. Гаркомам і Райкомам КП(б)Б у дэкадны тэрмін праверыць работу нарыхтоўчых арганізацый у справе кантрактацыі і нарыхтовак малака і масла, прыняўшы меры да забесьпячэньня выкананьня плянаў. СНК і Райкомам на працягу сакавіка—мая кожную дэкаду заслухоўваць даклады аб ходзе нарыхтовак малака і масла. ЦК даручае партыйным арганізацыям мабілізаваць увагу працоўных вакол пытаньняў малаканарыхтовак, ператварыўшы маючыяся масла-заводы і зьяўныя пункты ў арганізатараў нарыхтовак малака.

5. ЦК прапануе НКСнабу, Калгасцэнтру і раённым арганізацыям павесьці рашучую барацьбу з разбазараньнем масла і малака і ў асобных выпадках прыцягнуць вінаватых да судовай адказнасьці асоб і арганізацый, якія разбазараюць малако і малакапрадуктаў.

6. Катэгарычна запрапанаваць ГК і РК на ўвесь сэзон нарыхтовак не пераводзіць на іншую працу і не скарыстоўваць на другія кампаніі работнікаў маслазаводаў і спэцыялістых па малочнай справе. Аддзелу Кадраў ЦК у дэкадны тэрмін вылучыць работнікаў для Канторы Саюзмалака.

7. Культпропу ЦК даць паказаньне ўсім газэтам аб асьвятленьні ў друку нарыхтовак малака і масла.

У Барсэлёне арганізаваны рэвалюцыйныя саветы

ПАРЫЖ, 16-IV. Паводле паведамленьняў з Лёндану, у Барсэлёне (Гішпанія) створаны рэвалюцыйныя саветы.

Рэвалюцыйныя арганізацыі абвясьцілі ўсеагульную забастоўку. У рабочых раёнах горада адбываюцца сутычкі паміж рабочымі і паліцыяй. У Каталёніі абвешчана ваеннае становішча.

Рэвалюцыйныя рабочыя разьбіваюць склады са зброяй

ПАРЫЖ, 15. Паводле паведамленьня агенцтва Гавас з Сывільлі, там камуністы арганізавалі насуперакі забароны мітынг, на якім прамоўцы рэзка выступалі супроць буржуазнага рэспубліканскага ўраду. Удзельнікі мітынгу аказалі супраціўленьне паліцыі, якая прыбыла для разгону мітынгу. Адбылася крывавая сутычка.

Адступіўшы камуністы арганізавалі мітынг у другім раёне гораду. Камуністы аўладалі радам паліцэйскіх складаў зброі і захапілі адтуль зброю. Ля складаў зброі адбывалася жывая перастрэлка з паліцыяй. З абодвых бакоў шмат раненых.

Рэвалюцыйныя падзеі ў Гішпаніі нарастаюць

Кампартыя Гішпаніі стаіць на чале рэвалюцыйных мас

ЛЕНДАН, 16-IV. Кампартыя Гішпаніі агаласіла ў Барсэлёне дэкларацыю, у якой заяўляе, што рабочыя ні ў малейшай меры не спачуваюць новаму буржуазнаму ўраду і ня прымаюць новай дыктатуры.

«Працоўныя масы—зазначаецца далей у дэкларацыі, павінны аказаць супраціўленьне ўсякай рэакцыі з боку ўзброеных сіл. Рэспубліка ня можа быць умацавана бяз удзелу рабочых мас».

«Юманіт'э» паведамляе 13 красавіка праграму, з якой ішла на выбары гішпанская кампартыя: «супроць манархіі і буржуазнай рэспублікі, за рабоча-сялянскую савецкую Гішпанію. Экспропрыяцыя бяз выкупу зямель буйных земляўладальнікаў і перадача гэтых зямель сялянам; зьнішчэньне іпатэчных і іншых сялянскіх запазычанасьцяй; утварэньне сялянскіх камітэтаў барацьбы; падвышэньне зарплаты, скарачэньне рабочага дню».

У галіне нацыянальнай палітыкі гішпанская кампартыя ў процівагу буржуазнаму аўтанамізму, які зьяўляецца ў руках буржуазіі нацыянальных абласьцей зброяй барацьбы за свае прывілеі, выказвае прынцып поўнага самавызначэньня.

У галіне рабочай палітыкі кампартыя патрабуе падвышэньня зарплаты, устанаўленьня мінімуму апошняй, сямігадзіннага рабочага дню, увядзеньня сацыяльнага страхаваньня за кошт дзяржавы і прадпрыемцаў, прызнаньня правоў прафсаюзаў, адмены арбітражных камітэтаў і стварэньня фабзаўкомаў. Кампартыя заклікае на барацьбу супроць выключэньняў рэвалюцыйных элемэнтаў з рэфармісцкага і анарха-сындыкалісцкага прафабъяднаньняў, а таксама да адзінага пралетарскага фронту барацьбы.

Кампартыя патрабуе эвакуацыі войск з Марока, салідарызуецца з прыгнечанымі калёніяльнымі масамі, настойвае на прызнаньні СССР, патрабуе канфіскацыі маемасьці духавенства, выгнаньня ордэнаў, адмены рэлігійнага выкладаньня, зьнішчэньня вайсковага і судовага кодэксаў і прадастаўленьня палітычных і грамадзянскіх правоў салдатам.

Характарна зробленае на-дніях мадрыдзкай «Эль дэбатэ» указаньне на тое, што, улічваючы радыкальныя выступленьні на перадвыбарчых сходах, прамоўцы рэспубліканцаў і сацыялдэмакратаў прымушаны былі рассыпацца ў выказваньні сымпатыі да СССР. Газэта адзначае, што «Гішпанія зараз шмат чым напамінае Расію напярэдадні рэвалюцыі». (ТАСС).

Часовы ўрад на варце „законнага парадку“

ЛЁНДАН, 16-IV. Згодна паведамленьняў з Гішпаніі, міністры замежных спраў, фінансаў, юстыцыі і асьветы выступілі з дэкларацыямі, якія сьведчаць аб рэакцыйным характары новага рэспубліканскага ўраду і аб тым, што палітыка рэспубліканцаў будзе мала чым адрозьнівацца ад палітыкі ранейшага рэжыму дыктатуры.

Замежная палітыка, паводле слоў міністраў, пры новым урадзе амаль ня будзе зьменена, за выключэньнем узяцьця курсу на яшчэ большую «прыязнь» з Францыяй. З далейшых слоў міністраў вынікае, што часовы ўрад таксама будзе люта праследваць камуністаў і рэвалюцыйных рабочых.

ПАРЫЖ, 16. Мадрыдзкі карэспандэнт «Журналь» падае путаніцу з сацыялістычным міністрам часовага ўраду Прыета, які сьцьвярджаў, што ўрад даў былому каралю «гарантыю» недатычнасьці». На пытаньне ці мае намер урад прымяняць рэпрэсіі да роялістаў і арыстакратыі Прыета адказаў адмоўна, падкрэсьліўшы, што «быць роялістам—не злачынства».

«Па законах геалёгіі,—казаў далей Прыета,—няма галубой і чырвоных крыві». Прыета заявіў, што новы ўрад выканае ўсе абавязацельствы ў адносінах да замежных пазык

За рабоча-сялянскі ўрад

ПРЫВІТАЛЬНАЯ ТЭЛЕГРАМА ГІШПАНСКАЙ КАМПАРТЫІ АД ЦК ФКП.

ПАРЫЖ, 16-IV. ЦК кампартыі Францыі атаслаў гішпанскай кампартыі прывітальную тэлеграму.

«Кампартыя Гішпаніі,—гаворыцца ў тэлеграме,—мабілізуе рабочыя і сялянскія масы вакол лёзунгаў рэвалюцыйнай барацьбы. Працоўныя Гішпаніі павінны памятаць, што хоць кароль скінут, але ў краіне застаюцца капіталістычная эксплёатацыя і жабрацтва. Сацыялістычныя лідэры спрабуюць захапіць працоўных ілюзіямі, але рабочыя і сяляне Гішпаніі вельмі хутка перакапаюцца ў тым, што ўлада ў буржуазнай рэспубліцы належыць ня ім і што яны павінны рыхтавацца да бязьлітаснай барацьбы з буржуазіяй пад кіраўніцтвам гішпанскай кампартыі, за рабоча-сялянскую дыктатуру».

Эканамічны крызіс у ПАЗШ паглыбляецца

НЬЮ-ЁРК, 16. У процівагу аптымістычным заявам у коле дзяржаўных дзеячоў новы старшыня кіраўніцтва СТОН заявіў: «сучасная эканамічная дэпрэсыя зьяўляецца самай глыбокай і далёка ідучай за ўсю гісторыю чалавецтва (за апошнія 20 месяцаў прамысловая дзейнасьць пала на поўных 40 проц.).

СТОН патрабуе скарачэньня вытвор часьці кокса на 25 проц., каб, такім чынам, «зрабіць лягчэйшым цяжкасьці, якія узьнікаюць у сувязі са скарачэньнем «спажываньня»

ПАДАРОЖЖА ПАНА ГОЛУУКО

Вадомы «спэц» па беларускіх і ўкраінскіх справах, кіраўнік «уціхамірэньня» Заходняй Украіны п. Голуўко аб'язджаючы «крэсы» наведаўся ў Вільню, дзе прысутнічаў на праграмнай справаздачы беларускага нацыянал-фашыста Астроўскага (З газэт)

МАЛ. М. АСОТА.

Жывы водгук гішпанскай рэвалюцыі ў Партугаліі

На востраве Мадэры паўстанцамі арганізаваны часовы ўрад

ЛЁНДАН, 16. Рэвалюцыйныя падзеі ў Гішпаніі сустрэлі як заўсёды жывы водгук у Партугаліі.

У апошнія дні лёндансікімі газэтамі атрыманы паведамленьні аб узрастаючым рэвалюцыйным руху супроць партугальскага дыктатара Кармона, асабліва супроць падаткоўай палітыкі яго міністра фінансаў. Рэвалюцыйны рух пачаўся 5 красавіка на востраве Мадэры, дзе сабралася да 300 палітычных ссыльных, адбыліся хваляваньні, выкліканыя, як паведамляе «Дэйлі Тэлеграф», увядзеньнем урадавай манаполіі на хлеб. Мясцовы гарнізон далучыўся да паўстаўшых і губарнатар быў узяты ў палон. На востраве быў заражжа арганізаваны часовы ўрад.

Накіраваную для прыдушэньня паўстаньня каманду войска давялося тэрмінова выклікаць назад у Лісабон, бо каманда пачала брацца з насельніцтвам. Рэвалюцыйная ўлада острава аб'явіла сябе часовым урадам Партугаліі, а горад Панчал—часовай сталіцай Партугаліі.

Праз некалькі дзён пачаліся таксама хваляваньні на Азорскіх астравох, якія наколькі можна меркаваць па кароткіх вестках, знаходзяцца таксама ў руках паўстаўшых. У некаторых правінцыяльных гарадох узбуйтаваліся гарнізоны. Кармона мабілізаваў усе віды зброі і запяў з найбольш адданым яму войскам стратэгічныя пункты краіны. Урадавы будынак ахоўваецца войскамі, а сам дыктатар з другімі членамі ўраду перайшоў у казармы. Уведзе па найсуровейшая цэнзура, з-замежнай пераходзяць толькі патрэбныя зьвесткі.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

⊙ З Канады паведамляюць, што сьледам за адмовай прэм'ера Бенэта ўвесьці сацыяльнае страхаваньне ў радзе гарадоў Канады адбываліся сутычкі паміж беспрацоўнымі і паліцыяй. Як толькі гэта зрабілася вядомым, у галоўнейшых гарадох Канады зараз-жа былі арганізаваны дэманстрацыі. Тысячы дэманстрантаў—беспрацоўных накіраваліся да будынкаў м'ніцыпалітэтаў, дзе патрабавалі выдачы прадуктаў. Усюды супроць дэманстрантаў былі выстаўлены моцныя паліцэйскія атрады. Дэманстранты аба раніліся палкамі і каменьнямі.

⊙ З Афінскай турмы ў Сынгру зьбегла 8 зьняволеных камуністаў. Аслужаныя ўцікі пры дапамозе дзяжурнага турэмнага назіральніка, які таксама ўцёк.

⊙ Паводле паведамленьня нанкінскіх газэт у Цэйлунцзянскай правінцыі апэрыруе белагвардзейскі расійскі ўзброены атрад, які нападае на кітайскія вёскі і ўтварае грабяжы і забойствы. Паводле паведамленьняў газэты, у часе налёту на адну вёску, забіты адзін кітаец.

⊙ Вярхоўны суд у Лейпцыгу прыгаварыў сакратара акруговай арганізацыі кампартыі ў Кельне і дэпутата рэйхстагу тав. Кольніца да двух з паловаю гадоў зьняволеньня ў цытадэлі.

Тав. Кольніц абвінавачваўся ў падрыхтоўцы «здрады дзяржаве», і ў «парушэньні закону аб абароне рэспублікі», а таксама за распаўсюджваньне артыкулаў і лістовак, а таксама выступленьні на сходах, у якіх тав. Кольніц заклікае да дэманстрацый ня гледзячы на забарону паліцыі.

⊙ Былы Гішпанскі кароль Альфонс ужо ў працягу некаторага часу зьбіраецца ўцякаць і ў гэтых мэтах наведаў месяц назад Лёндан, каб прыняць меры да выратаваньня сваіх буйных прыватных капіталаў, якія ацэньваліся ў суме каля 3 з паловаю мільёнаў фунтаў стэрлінгаў (каля 35 мільёнаў рублёў). Галоўным чынам, ангельскія і амэрыканскія каштоўныя паперы. Рад ангельскіх арыстакратаў прапануе Альфонсу «гасьцінны прытулак» у Англіі

⊙ Паводле паведамленьня агенцтва Гавас з Марсэлю былы гішпанскі кароль Альфонс заявіў прадстаўніку гэтага агенцтва, што ён лічыць свае «вынаньне» часовым, і што ён рашыў пакінуць Гішпанію для таго, каб уникнуць усякага праліцьця крыві. Альфонс дадаў, што вырачэньне яго не канчатковае і, што ён «дзейнічаў» у зацежнасьці ад вынікаў усеагульных выбараў ва «ўрад».

◆ Ва ўсіх гарадох Нямеччыны адбываюцца арганізуемыя камсамолам магутныя дэманстрацыі рэвалюцыйнай моладзі. У Гамбургу паміж моладзьдзю і паліцыяй адбыліся сутычкі. У Брауншвэйгу арыштавана 340 маладых рабочых.

◆ Бэйрэцкія газэты паведамляюць, што ў французкай армі, у Сыры, «выкрыта камуністычная змова». Арыштаваны афіцэр па абвінавачваньні ў вядзеньні камуністычнай прапаганды. Арыштаваныя пакараны ваенна-палявым судом.

◆ Як паведамляюць з Бухарэста, румынскі ўрад унёс у парлямант праэкт новага закону аб друку, які цалкам аддае друк у рукі паліцыі. Гэты законапраэкт носіць, настолькі рэакцыйны характар, што нават буржуазныя партыі пратэстуюць супроць яго.

◆ У Сафіі і Варне адбыліся вялікія сходы пратэсту супроць прынятага балгарскім парлямэнтам закону аб «фізычным выхаваньні моладзі», г. зн. закону аб гвалтоўнай фашысцкай моладзі. На сходзе ў Сафіі паліцэйскія агенты справацыравалі сутычку з рабочымі, кінуўшы ў натоўп бомбы наб'тыя атрутнымі газамі. Паліцыя скарыстала справацыраваную сутычку і пачала разганяць сход, жорстка зьбіваючы іх палкамі, шомпаламі і гумовымі дубінкамі. Больш-менш цяжка ранены звыш 100 рабочых.

◆ Ваеннае міністэрства ПАЗШ дало на 1 мільён 259552 долярэў заказаў на новыя самалёты і самалётныя маторы. У ліку іншага заказана 30 назіральных самалётаў, 3 новага тыпу самалётаў для транспарту людзей і матар'ялаў і 128 новых матораў.

СУРОВА КАРАЦЬ

вінаватых у зрыве плянаў лёназагатовак

Прарывы на лёназагатоўчым фронце, марудная падрыхтоўка да будаўніцтва лёназаводаў БССР зьяўляецца перш за ўсё вынікам права-апартуністычнай практыкі лёнавагатоўчых органаў, вынікам разьліку на самацёк

Злачынная апартуністычнай бязьдзейнасьці і самацёчным настроям павінен быць накладзен рашучы канец

Абаронцы кулакоў зьняты з работы

14 красавіка чацьвёрка ЦК і СНК па загатоўках заслухала даклады Аршанскага, Расонскага, Рагачоўскага і Ляднянскага Райвыканкомаў аб ходзе выкананьня плану загатовак лёну.

Чацьвёрка прызнала, што па Аршанскім, Расонскім і Рагачоўскім раёнах выкананьне плану ільназагатовак праходзіць нездавальняюча. РВК і РК гэтых раёнаў прапанавана прыняць неабходныя захады да таго, каб пасіліць тэмпы загатовак і ў першую чаргу скончыць выкананьне плянаў дадзеных кулацка-заможным гаспадаркам. Гэтая праца павінна быць скончана не пазьней 25 красавіка.

Ляднянскі РВК далусьціў грубае парушэньне і скажэньне дырэктыў ЦК і СНК у адносінах дачы цьвёрдых заданьняў кулаком. Чацьвёрка прызнала, што дача кулацкім гаспадаркам заданьняў меншых чым у сярэднім прыходзіцца на адну бядняцка-середняцкую гаспадарку зьяўляецца простай абаронай кулакоў.

За такое парушэньне дырэктыў Чацьвёрка пастанавіла зьняць з работы старшыню Ляднянскага РВК.

Н.

Будаўніцтву пагражае зрыў

Згодна дырэктывы ўраду, з ліку 45 заводаў па першачарговай апрацоўцы лёну, у Высачанах павінен быць пабудаваны лёнапрацоўчы завод. Высачаны—гэта адзін з раёнаў, які адрозьніваецца вялікай колькасьцю лёнасеяў. Акроч таго, ў Высачанах маецца лёнакамбінат і пабудова заводу па першапачатковай апрацоўцы лёну набывае там вялікае значэньне.

Некалькі разоў камісія, створаная пры РВК, складала пляны пабудавы заводу, вызначала месца для пабудовы заводу. Некалькі разоў у Менску адхілялі праэкт Высачанскага РВК таму, што ён быў недастаткова распрацаваны, а ў другім выпадку месца выбранае для заводу аказалася на балоце і замест 12 з паловай га сухога пляцу, аказалася—3,8.

Толькі ў сакавіку месяцы быў зацьверджаны плян і вучастак нарэшце вызначаны.

Пачалася вожка лесу. Акроч таго, што вожка цягнулася надзвычайна марудна, дзесятнікі з жыльлёва-будаўнічай каапэрацыі забягалі па дарозе да лесу і перахоплівалі матар'ял, які вывозіўся на будаўніцтва лёназаводу. У сваю чаргу дзесятнік будаўніцтва лёназаводу заляжкаў яшчэ далей і так сама перахопліваў матар'ялы.

Да гэтага часу на завод яшчэ не завезена неабходная колькасьць цэглы, няма рабочай сілы, няма кватэр для рабочых.

Высачанскі РВК ня кіруе гэтай пабудовай, не адчувае адказнасьці за пабудову яе сёлета. З боку лёнааб'яднаньня няма належнага кіраўніцтва пабудовай гэтага заводу.

Пры ўсіх труднасьцях, аб якіх мы тут пісалі, паўстае пагроза будаўніцтва лёназаводу ў Высачанах, які мае ў нашых умовах вялікае значэньне.

Цюн.

Вушацкі раён—у абозе

Цэлы рад сельсаветаў Вушаччыны ня выканаў сваіх плянаў.

Завячэльскі сельсавет выканаў плян на 37,6 проц., Маслярскі на 23,5 проц., Жарскі на 22,3 проц., Чарапоўшчынскі, Кубліцкі і В. Данецкі выканалі свае пляны толькі на 13 проц.

У некаторых сельсаветах справа абстаіць яшчэ горш, на сёньняшні дзень яны яшчэ не прадставілі нават зьвестак аб ходзе лёназагатовак. Такіх зрыўлічыкаў плянаў трэба проста аддаваць пад суд.

Вушацкі раён па загатоўцы лёну ганебна плянецца ў хвасьце.

Хмель.

Пакараць зрыўшчыкаў апрацоўкі лёнавалакна

У сакавіку месяцы калгас «Чырвоны Араты» адпраўіў для здачы Цярахаўскаму Каапсаюзу 8 вазоў лёнавалакна. Гэтае лёнавалакно Каапсаюзам, было забракавана з прычыны нягоднай апрацоўкі.

Рэвізійная камісія калгасу разам з упаўнаважаным РВК наладзілі расьлед ваньне гэтай справы. Пры расьледваньні выявілася, што прыёмчык ад Каапсаюзу тав. Фарбераў у прыватнай гутарцы з кіраўнікамі калгасу сказаў «ня важна, калі і горш лён апрацаван—усёроўна цану я вам дам адну і тую-ж».

Камісія па расьледваньні гэтай справы ўстанавіла, што шкоднікам у гэтай справе зьяўляецца праўленьне калгасу. Яно ўпарта не прымае сваёй шкоды на работы, хоча гэту віну скінуць беспадстаўна на мэтад работы. Так, праўленцы заявілі: «Дрэннай апрацоўкі лёнавалакна зьяўляецца ўвядзеньне зьдзельнічыны».

Трэба зараз-жа пакараць шкоднікаў у апрацоўцы лёнавалакна калгасу «Чырвоны Араты».

Калгасьнік.

„Лёназагатоўкі нас не датычацца“

Лёназагатоўкі па Абчацкім сельсавеце Сьмілавіцкага раёну праходзяць на хвалях самацёку. Партыйна-камсамольская ячэйка і сельсаветы ў гэтым напрамку бязьдзейнічаюць. Пляны лёназагатовак на 25-III—31 г. выкананы ўсяго на 30—35 проц.

Партыйная ячэйка знаходзіцца ў баку ад гэтай важнай справы. Сакратар парт'ячэйкі кажа:

— Што нам займацца такім глупствам, як лёназагатоўкі. Гэта справа нас не датычыцца.

Сакратар камсамольскай яч. Крывіца адмаўляецца ісьці праводзіць сходы сялян па выкананьні лёназагатовак, займацца п'янствам. Калі яго пытаеш:—Чаму камсамольская ячэйка ня прымае ўдзелу ў выкананьні лёназагатовак?—дык Крывіца кажа:

— Лёназагатоўкі ня ёсьць наша справа. Мы ня можам гэтым пытаньнем займацца.

Брыгадзір «С. Б.» Цімох Л.

Сумныя лічбы

Ад 9 да 18 сакавіка загатоўлена 5 цэнт. лёнанасеньня, 16 цэнт. лёнавалакна, 1,5 цэнт. пяньні і 4 цэнт. паклі. Такім чынам загатоўка лёнанасеньня за апошнюю дэкаду павысілася на 0,6 проц., лёнавалакна на 1,8 проц. у параўнаньні з гадавым плянам і 3,2 проц. да квартальнага заданьня, загатоўка пяньні павысілася на 0,7 проц. да гадавога пляну і на 15 проц. да квартальнага.

Праўленьне спажывецкага таварыства суправаілася на тым, што дало (у другі раз) дырэктыву ніізавым таварыствам аб «павялічэньні тэмпаў лёназагатовак» і паслала трох агентаў з дэфіцытнымі таварамі.

Вынікі дзесяцідзённых разьедаў вельмі сумныя, бо агенты прывозяць ніязначную колькасьць лёну.

Цьвёрдыя заданьні да кулацкіх гаспадарак калі і даведзены, дык ня выконваюцца. Маюцца толькі два ці тры выпадкі атрыманьня лёнавалакна па цьвёрдых заданьнях. Гэта тлумачыцца тым, што сельсаветы ячэ ня прымаюць належных мер да выкананьня заданьняў.

Пастанова Гаркому партыі аб узмацненьні тэмпаў лёназагатовак засталася на вывешанай.

Знаёмы.

„Дрэннае кадвор'е“ перашкаджае лёназагатоўкам

На апошнім паседжаньні Капцэвіцкай РСІ (Петрыкаўскі раён) стаяла пытаньне аб зрыве лёназагатовак. Члены РСІ—Кошк Ш. і Зарэцкі Ю., якія былі вылучаны на работу ў гэтай галіне—за ўвесь тэрмін нічога не зрабілі. Знайшліся ўважлівыя прычыны гэта—«дрэннае кадвор'е». У выніку такіх адносін да гэтай важнай справы, выкананьне пляну па раёне дае толькі 25—30 проц.

Сельсаветы таксама не змаглі мабілізаваць сябе вакол лёназагатовак і не паінсулі як сьлед на кулацкія гаспадаркі.

Цікава, што РСІ, разгледзеўшы канкрэтныя абнаўйцаў зрыву лёназагатовак, толькі абмежавалася вынясьненьнем ім папярэджаньня.

Так мягка адносіцца да зрыўшчыкаў лёназагатовак нельга.

З.

Камвузаўцы адказваюць на вылазку клясавага ворага

(Рэзалюцыя агульнага сходу студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў Камуністычнага Унівэрсытэту імя Леніна)

Агульны сход студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў КУБ, заслухаўшы інфармацыю аб контр-рэвалюцыйнай, вялікадзяржаўнай вылазцы пастаўшка Чудзіна адказвае:

1. У сувязі з абастрэньнем клясавай барацьбы ў краіне і ўзмацненьнем супраціўленьня аджываючых клясаў раз горнутаму сацыялістычнаму наступленьню, мае месца актывізацыя вялікадзяржаўнага шавінізму і мясцовага нацыяналізму.

2. На даным этапе вялікадзяржаўны расійскі шавінізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай, адбіваючы імкненьні аджываючай клясы, раней пануючай нацыі, да ўстанаўленьня сваіх страчаных прывілей.

3. За апошні час у БССР меў месца рад вылазак вялікадзяржаўнага шавінізму. Адзін з такіх агашлелых вылазак клясавага ворага зьяўляецца вылазка Чудзіна.

4. Заява Чудзіна на імя Жыткавіцкага Раёнаго зьяўляецца дакумантам адкрыта - агашлелага праяўленьня вялікадзяржаўнага шавінізму, праз які выпірае азьвярэлы твар кулака на вёсцы, нэмана ў горадзе—клясавых ворагаў сацыялістычнага будаўніцтва.

5. Выступленьне Чудзіна супроць беларусізацыі, патэрэньне ім вялікадзяржаўных і нацдэмаўскіх паклёпаў аб штучнай беларусізацыі, імкненьне русіфікіраваць нацыянальныя школы зьяўляецца адкрытым контр-рэвалюцыйным выступленьнем супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі, супроць пралетарскае дзяржавы.

6. Зьяўляючыся нападам на ленінскую нацыянальную палітыку правадзімую КП(б)Б, выступленьне Чудзіна становіць сабой пераклік з контр-рэвалюцыйным беларускім нацдэмакратызмам, які знаходзіцца ў саюзе з беларускім нацфашызмам і польскім фашызмам, рыхтуючым узброены напад на СССР. Чудзін хоча ехаць у РСФСР на вытворчасьць. Няма яму месца на вытворчасьці ні ў РСФСР, ні ў другой рэспубліцы СССР, як клясаваму ворагу дыктатуры пралетарыяту, падтрымліваючаму вялікадзяржаўных і нацдэмаўскіх рэстаўратараў капіталізму—інтэрвэнтаў.

Сход ухваляе пастанову ЦП саюзу Прагасьветы аб выключэньні клясавага ворага Чудзіна з членаў прафсаюзу.

Адзіным адказам на клясава-варожы выпад Чудзіна будзе яшчэ большае згуртаваньне рабочых і працоўных мас вакол КП(б)Б, яшчэ больш рашучае правядзеньне беларусізацыі, яшчэ больш бязьлітасная і сыстэматычная, штодзённая, бязупынная барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам, з контр-рэвалюцыйным нацдэмакратызмам і з шавінізмамі іншых колераў.

Мы, камвузаўцы, у адказ на контр-рэвалюцыйную вылазку Чудзіна будзем яшчэ больш рашуча змагацца з усімі ўхіламі і хістаньнямі ад ленінскай нацыянальнай палітыкі і дабіваемся поўнага выкананьня дырэктыў партыі па беларусізацыі; у сваёй практычнай рабоце на фабрыках, заводах, саўгасах і калгасах будзем застрэльшчыкамі ў правядзеньні нацыянальнай палітыкі КП(б)Б.

Няхай жыве КП(б)Б—адзіны правадыр пабудовы сацыялізму ў БССР, росквіту нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу культуры БССР.

18 красавіка г.г. а 6 г. увеч. памяшк. Гаркому КП(б)Б (заля пасядж.)

СКЛІКАЕЦЦА

АБ'ЯДНАНЫ ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б І ГАРАДЗКОЙ КАНТРОЛЬНАЙ КАМІСІІ КП(б)Б.

Парадак дню:

1. Вынікі выкананьня прамфінпляну па гор. Менску за 1-шы квартал і далейшыя задачы.
2. Аб п дрыхтоўцы да веснавой сяўбы і ходзе колектывізацыі.
3. Становішча і плян разьвіцця камунальнай гаспада

Штурмавымі калёнамі ў паход за зьдзельшчыну!

НАНОСЯЧЫ РУЙНУЮЧЫ УДАР ПА КУЛАКУ І ЯГО АГЕНТУРЫ—ПРАВЫХ І „ЛЕВЫХ“ АПАРТУНІСТЫХ, НЕАДКЛАДНА ДАБІЦЦА БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЬЦІ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ!

Зьдзельшчынай, сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам

нанясем руйнуючы ўдар па кулаку

Азнаёміўшыся з заклікам газэты «Савецкая Беларусь» аб паходзе за зьдзельшчыну ў калгасах і пастановамі III Усебеларускага зьезду калгасаў, мы, калгаснікі калгасу «Пралетары», Ельскага раёну, Мялешкаўскага сельсавету ў ліку 500 працоўных адзінак, цалкам падтрымліваем пераход на зьдзельную работу ў калгасах.

Зьдзельшчыну мы прымаем і ўводзім яе з 8-га красавіка 1931 г. Праз зьдзельшчыну мы выканаем намечаныя пляны нашай работы.

Мы павялічваем на 300 проц. сваю пасеўную плошчу ў параўнаньні з мінулым годам, а таксама разгортваем сацбудаўніцтва.

Мы сеем бульбы замест 8 га ў мінулым годзе, 50 га сёлета, аўсу—замест 18 га летась—49 га, гароху—замест 2 га—8 га, канюшыны—замест 12 га—20 га, лубіну, якога летась зусім ня сеялі,—7 га, тытуну—замест 0,5 га—2 га, лёну—замест 1,5 га—10 га і канапель—замест 0,12 га—5 га.

Мы пабудуем пачаты ўжо хлеў на 150 галоў жывёлы, і стайню на 100 коняй.

Неўзабаве пускаем у ход параны млын, які будзе абслугоўваць ваколічнае насельніцтва.

Мы адзначаем, як недахоп у нашай рабоце, малую ўвагу да стварэньня кармавых фондаў, слабую дысцыпліну ў кармленьні жывёлы. Зараз мы перажываем кармавы крызіс. Гэта стварылася па віне нашых вытворчых камісій, якія не справіліся з выкананьнем плянаў кармавой базы.

У нас яшчэ адсутнічае культмасавая работа. Слаба працуе наша хата-чытальня, маюцца некаторыя перашкоды з боку кааперацыі, якая не павярнулася тварам да калгасу.

Недастаткова наладжана жывая сувязь з Калгассаюзам у сэнсе ўсе баковай дапамогі; уся гэта работа цалкам ускладаецца на нас самых.

Каб справіцца з задачамі, каб лік відаваць прарывы, мы, актывісты калгасу «Пралетары», былыя чырвоныя партызаны, беднякі і сераднякі, дэлегаты-актывісты ў ліку 18 асоб абвяшчаем сябе ўдарнікамі, уліваемся ў адну суцэльную згуртаваную брыгаду ў дапамогу нашаму праўленьню, каб выканаць плян сяўбы.

Мы даем нашай ўдарнай брыгадзе назву газэты «Савецкая Беларусь».

Мы ставім сваёй задачай уласнымі сіламі пры бальшавіцкай энэргіі і пад кіраўніцтвам Ленінскай камуністычнай партыі выканаць і перавыканаць ускладзеныя на нас абавязкі.

Ударная брыгада імя газэты «Савецкая Беларусь» з калгасу «Пралетары»:

Белы Янка, Вечар Янка, Жыльскі Хвёдар, Гусак Хвёдар, Белы Міхась, Гусак Сава, Суханіцкі Паўла, Ласоўскі Юльян, Фрыдман Арон, Жымскі Алесь, Ціханава Вульяна, Жыльскі Максім, Маскам чук Ганна, Карпман Цыля, Караткевіч Алеся, Палятчук Арсень, Грайфэр Янка.

Дырэктывы партыі і ўраду выканалі. Сяўбу спаткаем па-ўдарнаму

У выніку сталай прапрацоўкі пастаноў VI Усесаюзнага зьезду Саветаў, III Усебеларускага зьезду калгасаў і закліку газэты «Савецкая Беларусь» аб увядзеньні ў калгасах новых мэтадаў арганізацыі працы—зьдзельшчыны, калгасы Ельшчыны маюць значны прыліў у свае рады, Адначасна арганізоўваюцца новыя калгасы.

Ельскі раён на сёньняшні дзень ужо выканаў заданьне партыі і ўраду аб калектывізаваньні да пачатку веснавой сяўбы 30 проц. бядняцка - серадняцкіх гаспадарак. На 14 красавіка ў 72 калгасах аб'яднана 1902 гаспадаркі, або 30,2 проц. агульнай колькасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну.

Для правядзеньня веснавой сяўбы райком КП(б)Б і райвыканком мабілізавалі каля 25 працаўнікоў, якія прымацаваны да кожнага сельсавету на ўвесь час пасеўкампаніі. Па многіх калгасах вылучаны спэцыяльныя брыгады для работы па калектывізацыі ў больш адсталых мясцох.

Работа раённых арганізацый зараз цалкам згрупавана на падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай сяўбы і хутчэйшым сканчэньні пераводу калгасаў на зьдзельшчыну. Факты падвышэньня прадукцыйнасьці працы, палепшаньня яе якасьці пры ўвядзеньні зьдзельшчыны ўшчэнт разьбіваюць агітацыю кулака і сымулянта аб тым, што нібыта зьдзельшчына закабаляе калгаснікіа.

Пробны выезд у поле, які ўжо адбыўся ў большасьці калгасаў, паказаў сапраўдную гатоўнасьць калгасаў да сяўбы. На калгасах Ельшчыны на сёньняшні дзень бадай што скончан рамонт с.-г. інвэнтара: плугі адрамантавана ны на 98 проц., бароны—на 97 проц., збруя—95 проц. Калёсы з-за адсутнасьці шыннага жалеза адрамантаваны толькі на 78 проц.

Пасеўныя пляны даведзены да ўсіх калгасаў поўнасьцю. Земляпакаазаньне калгасам заканчваецца. Насенныя матар'ялы ачышчаны поўнасьцю. Мінэральнае ўгнаеньне забрана са складаў на 87 проц.

У калгасы прывезена па санным дарозе да 100.000 штук цэглы для будаваньня сілосных ям. На сёньняшні дзень бадай што скончана вывазка лесаматэрыялу для будаўніцтва. На 8 калгасах ужо распачата будаўніцтва сьвінарнікаў.

Старшыня Бугуціцкага сельсавету, Ельскага р-ну тав. НЕУМЯРЖЫЦКІ А., цяжка паранены кулакамі 13-IV—31 г. праз важкно ў в. Вішанцы.

Сяўбу правядзем па-ўдарнаму

Наш калгас «Ударны» (Магілеўскі раён) арганізаваўся нядаўна. Кулакі і іх падпявалы распаўсюджвалі чутак, што ўвесну будзе вайна, а таму ня трэба ўступаць у калгас, а лепш пачакаць да вясны.

Не зважаючы на ўсе кулацкія запалохваньні, у калгас уступіла 33 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі. Калгас нікі ачысьцілі насеньне, і рыхтуюцца да спатканьня другой бальшавіцкай вясны.

31 сакавіка настаўнік нашай школы на сходзе бядняцка-серадняцкіх мас зрабіў даклад аб калгасным будаўніцтве і з лічбамі ў руках давёў перавагу калектыўнай гаспадаркі над індывідуальнай. Тут-жа на сходзе 8 беднякоў і сераднякоў падалі заявы аб уступленьні ў калгас.

Насеньне ў нашым калгасе ачышчана на ўсе 100 проц., плугі адрамантаваны, нават мы яшчэ адрамантавалі і для другіх калгасаў 18 плугоў. Наш калгас гатовы для выязду ў поле.

Адна бяда, што ў нас не хапае на насеньне бульбы, пудоў каля 1.000 і вікі пудоў 50. Гэты недахоп мы імкнемся ліквідаваць. Райкалгассаюз па вінен аказаць нам таксама дапамогу ў набыцьці патрэбнага насеньня.

С. К. Пар-ч.

Замест Бабруйску—у Жыткавічы

Прыцягнуць галавацяпаў да адказнасьці

Бабруйск, 17-IV (наш. кар.). Трактары калгасаў ня могуць выйсьці ў поле, бо няма запасных частак. Ня гледзячы на неадназовыя патрабаваньні, запасныя часткі не прысланы. Высьветлена, што з-за галавацяпства адпраўнікоў запасныя часткі для Бабруйскіх трактароў трапілі ў Жыткавічкі раён. Замест тэрміновай прысылкі запасных частак, Белкалгасцэнтр вядзе з Райкалгассаюзам бюракратычную перапіску. Гэтай перапіскі павінен быць пакладзены канец. Запасныя часткі павінны быць тэрмінова высланы, бо з-за адсутнасьці іх зрываецца гадрыхтоўка да сяўбы.

Дамброўскі.

Узмацняем калгасныя рады

У выніку добра пастаўленай растлумачальнай работы маецца значны прыліў у калгасы Шыркаўскага сельсавету, Расьнянскага раёну. Так, у калгас «Шлях Леніна» улілося 45 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Працягваецца далейшы рост калгасных радоў за кошт адназобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Калгасы і адназобны сэктар актыўна на рыхтуюцца да сяўбы. Ачыстка насеньня скончана, сельска-гаспадарчы інвэнтар адрамантаваны, цягавая сіла ў спраўнасьці.

А. Палонскі.

Калгас „Новая зара“ гатоў да выхаду ў поле

Калгас «Новая Зара», Капыльскага с.-с., Халопеніцкага раёну існуе другі год. Калгас значна вырас за гэты час.

Калгас як сьлед падрыхтаваўся да сяўбы, цалкам ачышчана насеньне, завезена патрэбная колькасьць угнаеньня і вапны, цалкам адрамантаваны інвэнтар. Калгас гатовы да выезду ў поле.

Калгас вычысьціў з сваіх радоў злачынны элемэнт. Былі такія, як напрыклад, Паус Якуб, які расьцягваў калгасную маемасьць і займаўся крадзяжом у калгасе. Пасьля чысткі калгасу і аддачы злодзеяў пад суд, работа стала на ўдарныя тэмпы.

Арфа.

Падгайцаўскі сельсавет

плян кантрактацыі выканаў на 100 процантаў

Падгайцаўскі с.-с., Шклоўскага раёну, добра справіўся з мерапрыемствам па правядзеньні кантрактацыі яравых пасеваў. Адозва ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб кантрактацыі яравых пасеваў была шырока папулярызавана сярод бядняцка-серадняцкіх мас сельсавету. Пляны кантрактацыі пры абмеркаваньні на апульных сходах, прымаліся аднагалосна ўдзельнікамі сходу. У выніку добра пастаўленай работы на 1 красавіка плян кантрактацыі яравых пасеваў па Падгайцаўскім сельсавеце выкананы на 100 проц.

У-н.

Бярэце прыклад з лядняцаў

Настаўніцы калектыву, Лядняпскай школы саўгаснага вучнёўства і ШКМ, абгаварыўшы адозву X Усебеларускага зьезду саветаў аб месячніку ліквідацыі прарываў разгарнуў шырокую масавую работу, арганізаваўшы брыгады. Кожная брыгада прымацавана да вёсак Сазонаўскага с.-с., які надзвычайна адстаў у справе разгортваньня калгаснага будаўніцтва. Брыгады правялі шырокую растлумачальную работу аб калгасным будаўніцтве: на сходах бедняковаў і серадняковаў распрацавалі пастановы X зьезду саветаў даклад тав. Якаўлева і інш палітычныя дакумэнты.

Пры перавыбарах праўленьня калгасу ў вёсцы Лазараўка брыгадай былі выкрыты ўсе хворыя бакі, якія тармазілі прыліў у калгас.

Брыгада, прымацаваная да Лядняпскіх пасёлкаў, пасьля растлумачальнай работы, арганізавала калгас з бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Арганізаваны таксама калгасы ў вёсках Каточшчына і Міхееўка.

Дудзько.

Раўняцца па перадавых сельсаветах

Бязьлітасна змагацца з кулаком і яго агентурай

Бабруйск (наш кар.). Апартуністычная недаацэнка праяўленая з боку бабруйскіх раённых арганізацый да рэалізацыі адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі зараз-жа пасьля яе выданьня адбілася на правядзеньні гэтай работы.

Работа па кантрактацыі праходзіць надзвычай маруднымі тэмпамі. Большасьць сельскіх саветаў яшчэ і да гэтага часу не ўсьвядомілі ролі кантрактацыі ў агульнай рабоце па сацыялістычнай перабудове вёскі і праводзяць гэтую работу чэрапашымі тэмпамі. Аб гэтых «тэмпах» гавораць лічбы. Паводле вестак на 25 сакавіка, замест вызначанай плошчы лёну ў 1848 га, закантрактавана ўсяго толькі 131 га, па канюплях—замест 85 га, закантрактавана каля 11 га. Па звычайным аўсе процант кантрактаванай плошчы дасягае 7—8 проц. агульнага раённага пляну.

Плянам прадугледжана шырокае разгортваньне кантрактацыі траў у мэтах стварэньня кармавой базы для разгортваньня жывёлагадоўлі ў раёне. На справе-ж кантрактацыя пасеваў траў праходзіць надзвычай марудна. Па канюшыне плян выкананы на 25 проц. віцы—12—14 проц. і г. д. Адна толькі кантрактацыя махоркі ідзе са значным перавялічэньнем пляну.

Тураўскі сельсавет па вёсках праводзіць пастановы аб выкананьні пляну кантрактацыі «па мягчымасьці», у некаторых вёсках пытаньне аб правядзеньне кантрактацыі пакідаецца «адкрытым». Гэта правая практыка сельсаветаў грае на руку кулаку. Дрэнна праводзіць работу Сычкаўскі і Харлапавіцкі сельсаветы.

Бортнікаўскі сельсавет, разгортваючы шырокую работу па кантрактацыі, выканаў плян з перавышэньнем. Таксама добра праходзіць работа па кантрактацыі па Капусьцінскім і Паўлаўскім сельсаветах. **Па 5-е красавіка Капусьцінскі сельсавет поўнасьцю выканаў плян па кантрактацыі, Паўлаўскі сельсавет выканаў плян на 120 проц. У Бортнікаўскім сельсавеце кантрактацыя яравых праводзіцца ўдарнымі тэмпамі.**

Па калгасным сэктары пасьпяхова ідзе кантрактацыя канапель, бульбы, аўсу, ячменю, гароху і траў. Па 6 сельсаветах выкананьне кантрактацыі гэтых культур дасягае 50 проц., а па некаторых культурах (гарох, крупяныя) і звыш 100 проц.

Злачынна-недапушчальным прарывам у рабоце па кантрактацыі пасеваў зьяўляецца скарачэньне па радзе сельсаветаў пляну кантрактацыі тэхнічных культур за кошт павялічэньня зярнёвых. Гэты прарыў павінен быць зараз-жа выпраўлены. Пляны кантрактацыі траў і тэхнічных культур павінны быць выкананы цалкам. З гэтай шкоднай тэндэнцыяй вынішчэньня пляну кантрактацыі тэхнічных культур трэба рашуча змагацца.

Бяручы прыклад з перадавых сельсаветаў, якія скончылі выкананьне пляну кантрактацыі, астатнія сельсаветы раёну праводзячы работу па ўдарнаму, павінны забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне пляну кантрактацыі ў бліжэйшыя дні.

Д. Аланскі.

Віцебскі гаркаапсаюз зрывае кантрактацыю яравых

Дырэктыва партыі і ўраду аб 100-процантным правядзеньні кантрактацыі яравых у Віцебскім раёне выконваецца надзвычайна марудна. Сельска гаспадарчы сэктар Віцебскага гарсавету і Віцебскі гаркаапсаюз не пераключыліся на ўдарныя тэмпы работы і не мабілізавалі грамадзкую думку на выкананьне важнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыемства, якім зьяўляецца кантрактацыя яравых пасеваў.

Калі па калгасах кантрактацыя праходзіць здавальняюча, дык зусім амаль нічога ня зроблена па кантрактацыі яравых пасеваў па аднаасобным сэктары. На 12 красавіка плян кантрактацыі па калгасным сэктары выкананы на 99 проц., па аднаасобным сэктары—7 проц. Так заданьне па кантрактацыі бульбы выканана на 5,6 проц., вікі—4,7 проц., бабовых культур —2,5проц., лёна-валакна—8 проц., цімафеёўкі—3,8 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб яўнай пагрозе зрыву кантрактацыі ў аднаасобным сэктары.

Трэба зараз-жа мабілізаваць усе сілы на поўнае выкананьне пляну кантрактацыі яравых пасеваў у аднаасобных сэктарах Віцебскага раёну.

Да 5-га мая заданьні па кантрактацыі павінны быць выкананы з перавышэньнем.

Брыгада газ. «Сав. Бел.»

Н. Дварсон, Міркін.

Аршанчына яшчэ не ліквідавала прарывы ў падрыхтоўцы да сяўбы

Галоўныя задачы, якія зараз стаяць перад партыйнымі, савецкімі і калгасна-кааперацыйнымі арганізацыямі — гэта сканчэньне засыпкі насенных і фуражных фондаў у калгасах, пераход на зьдзельшчыну калгасаў і саўгасаў, ліквідацыя абязьлічкі і сканчэньне рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтара. На гэтыя задачы, на іх выкананьне, у сваёй пастанове ЦК УсеКП(б) зьвяртае ўвагу ўсіх партыйных арганізацый. Без насеньня, без кармоў, бяз зьдзельшчыны, бяз ліквідацыі абязьлічкі і бяз поўнасьцю падрыхтаванага інвэнтара калгасы ня змогуць выканаць праграму другой бальшавіцкай вясны.

Як-жа абстаіць справа ў гэтым напрамку ў Аршанскім раёне і ці выкананы гэтыя галоўныя задачы? Трэба сказаць проста, што Аршанскі раён не падыйшоў яшчэ як сьлед да выкананьня галоўных задач. Насеньнем раён яшчэ не забясьпечаны. Насенныя фоды поўнасьцю ня створаны. Нават па зярнёвых культурах і па бульбе плян засыпкі насенных фондаў выкананы ўсяго на 90 проц. Па кармавых кораньплодах насеньнем забясьпечаны на 12 проц., сіласных культур—на 2,5 проц., тэхнічных культур—на 90 проц., вікі—на 35 проц., лубіну—на 10 проц. канюшыне—25 проц., цімафейкі—35 проц. Насеньне гародных культур амаль зусім адсутнічае (трэба 153 цэнтнеры—ёсьць усяго 1,5 цэнтн). Таксама ня поўнасьцю створаны страхавыя фонды: замест 529 цэнтн. засыпана толькі 413 цэнтн., такім чынам, адна з галоўных задач—стварэньне насенных і страхавых фондаў па Аршанскім раёне далёка ад выкананьня.

Другая задача—стварэньне фуражных (кармавых) фондаў на час сяўбы. Тут мы маем ужо прарыў і вельмі значны. Райкалгассаюз ня ведае наколькі калгасы забясьпечаны кармамі і як абстаіць справа з бранированымі фондамі. Паводле яго вестак, якія ён дае ў Наркамзем, у калгасах бранированы фонды складаюць па сене і саломе—2500 цэнт. замест 5500 цэнт. па пляну і па аўсу—1200 цэнт. (плян 1600 цэнт.). Адкуль Райкалгассаюз узяў гэтыя лічбы—невядома. Ніякіх дакумэнтаў, якія-б падцьвердзілі іх сапраўднасьць у Райкалгассаюзе няма. Наадварот, ёсьць весткі ад калгасаў, якія даволі яскрава гавораць, што аўсу забранірована толькі 613 цэнт. і сена—907 цэнт. Зараз і гэтыя лічбы ўжо ня могуць зьяўляцца сапраўднымі, бо ў сувязі з заціжкай зімы, многія калгасы ўжо скармілі частку бранированых фуражных фондаў. А калі да гэтага яшчэ дадаць, што многія калгасы, як напрыклад «Ларыноўка», імя ЦВК БССР, «Агульная праца», «Чырвоны Берег», «Берасьцеева», «Чырвоны Кастрычнік» і іншыя засталіся зусім без кармоў, дык у гэтым напрамку мы маем і зусім пагражаючае становішча. Гэта значыць, што Райкалгассаюз дае няправільныя весткі і Белкалгасцэнтру і Наркамзему аб становішчы з кармамі, аб забраніраваньні кармавых фондаў.

Ня гледзячы на вялікія цяжкасьці з кармамі, па раёне яшчэ ня выкананы пляны загатовак фуражу. Кулацка-заможныя гаспадаркі (в. Багрынава, Машкоўскага сельсавету і г. д.) замест здачы сваіх лішкаў фуражу дзяржаве, разбазарваюць іх на прыватным рынку. На гэта ізусім не рэагуюць ні сельсаветы, ні раённыя ўстановы і арганізацыі.

Перавод калгасаў і саўгасаў на зьдзельшчыну і ліквідацыя абязьлічкі—гэта трэцяя задача. Гэтая задача таксама ня выканана нашым раёнам. На сёньняшні дзень толькі 31 калгас цалкам і 6 часткова перайшлі на зьдзельшчыну. Такім чынам, з 96 калгасаў раёну толькі 37 перайшлі на зьдзельшчыну і ліквідавалі абязьлічку. Процант зусім нязначны. Гэта мерапрыемства праводзіцца ў жыцьцё вельмі і вельмі марудна і калі за яго ня ўзяцца на сапраўднаму, па бальшавіцку, дык да пачатку сяўбы калгасы Аршанчыны не пасьпеюць ліквідаваць падзеншчыну і абязьлічку.

Што да таго, як праходзіць рамонт інвэнтара, дык у Райкалгассаюзе няма дакладных вестак. Але ўсё-ж такі пробныя выхады некаторых калгасаў ў поле сьведчаць аб тым, што большасьць калгасаў адрамантавалі свой інвэнтар.

З усяго гэтага відаць, што галоўныя задачы пастаўленыя партыяй па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай ў нашым раёне яшчэ ня выканаы. Партыйныя, савецкія і калгасна-кааперацыйныя арганізацыі раёну павінны зараз-жа мабілізаваць усе сілы і сродкі на выкананьне гэтых галоўных і рашаючых задач, каб пасьпяхова правесьці праграму другой бальшавіцкай вясны.

А. К.—н.

Перайшлі на зьдзельшчыну 31 калгас. Ня ўведзена яшчэ зьдзельшчына у 62 калгасах

Шклоў, 13-4. (Наш. кар.). У Шклоўскім раёне перайшлі на зьдзельшчыну 31 калгас. Першымі перайшлі на зьдзельшчыну калгасы «Пэўны Шлях» і «Барацьба». Астатнія 62 калгасы пакуль што не выпрацавалі пляны работы па зьдзельшчыне. З боку райкалгассаюзу прынятыя ўсе меры для дапамогі пераходу на зьдзельшчыну. Падрыхтоўка кадраў ужо праведзена. Скончыліся аднаасобныя курсы старшынь калгасаў (скончыла 30 асоб). Праведзены зьезд жанчын-калгаснац. Зараз працуюць яшчэ курсы рахункаводаў на 45 асоб, якія канчаюць работу да 1-га мая. Па лініі МТС канчаюць 180 асоб курсы па падрыхтоўцы трактарыстаў.

Капыльскі райкалгассаюз мяняе добрае насеньне на дрэннае

Для сяўбы патрабуецца добрае насеньне. Сёлета па БССР намечана значная работа па правядзеньні абмену звычайнага насеньня на сартавое. Але Капыльскі Райкалгассаюз зусім мякка уяўляе сабе гэтае мерапрыемства—па яго дырэктыве добрае насеньне абмяняі на дрэннае.

Райкалгассаюз даў загад калгасу «Араты», Песчанскага сельсавету, адвезьці свой насенны авёс і ячмень (97 проц. ўсхожасьці) у саўгас Доктаровічы і абмяняць яго на насеньне якое мае 99 проц. ўсходнасьці.

Адказныя арганізацыі павінны за няцца гэтай справай і прыцягнуць вінаватых да суровай адказнасьці.

В. М.

Што нам дала зьдзельшчына

Калгас «Колас» амаль што першы з усіх калгасаў Бабруйскага раёну перайшоў на зьдзельшчыну ўвёўшы яе бадай ва ўсіх галінах гаспадаркі. На дапамогу калгасу ў выпрацоўцы норм і зьдзельных расцэнак прышлі аграном. Сумесна з калгасным актывам нормы і расцэнкі былі шырока прапрацаваны. Зьдзельшчына была ўхвалена ўсім калгасам і на справе даказала сваю пераважнасьць перад былой формай працы.

Бывала, калі прыходзілася пасылаць людзей у лес за дрывамі, або за бярвеньнем, дык пачыналася цяганіна. Старшыня калгасу загадваў ехаць у лес Пятру—Пётра ківаў на Янку, спасылаліся на адсутнасьць ботаў, змораласьць, на хваробу і іншыя прычыны для таго, каб ухіліцца ад работы.

Цяжка было працаваць кіруючому складу калгасу ў такіх умовах ды і прадукцыйнасьць працы была вельмі невялікай.

Раней, калгаснік ехаў у лес на кані. Аб тым, каб гэты самы калгаснік абслужыў два кані і гаварыць было немагчыма. Такая справа лічылася немагчымай. Зьдзельшчына-ж паказала адваротнае. Цяпер пры паездках у лес кожны калгаснік дабраахвотна бярэ пад свае абслугоўваньне дзьве-тры фурманкі.

Па возцы цэглы пры зьдзельшчыне калгаснікі перайшлі на абслугоўваньне пяці-пасьці фурманак. Разьбіўка калгаснікаў на брыгады значна дапамагла гэтаму. Цяпер па накладцы лесу існуе брыгада. Па накладцы цэглы таксама існуе брыгада. І справа ідзе куды спарней, чым раней, і выпрацоўка кожнага калгасніка паднялася значна вышэй.

У сувязі з разьбіўкаю на брыгады і ўвядзеньнем зьдзельшчыны ў калгасе разгортваецца сацспаборніцтва. Калі раней для абслугоўваньня кароў (догляд, кармленьне) на кожныя 20 галоў у калгасе прызначаўся адзін калгаснік, дык пасьля зьдзельшчыны гэты самы калгаснік спраўляецца даглядзець 30 галоў. Калгаснікі лічаць гэта зусім нармальным, цалкам спраўляюцца з працаю і, апрача таго, бяруць на сябе дабраахвотна яшчэ дадатковую нагрузку.

Асабліва яскрава відаць павялічэньне прадукцыйнасьці працы ў калгасе пры возцы гною. Раней, да ўвядзеньня зьдзельшчыны, у дзень калгаснік на адным кані вывозіў 5 возаў, а пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны вывозіць 10 возаў. Пры абмалоце брыгада калгаснікаў норму працы, вызначаную на 300 гадзін, канчае за 250-270. Апрача павялічэньня прадукцыйнасьці працы, палепшылася і якасьць яе.

З увядзеньнем зьдзельшчыны разьбіліся ўшчэнт кулацкія путаркі аб тым, што пры зьдзельшчыне ў калгасах загіне ад цяжкай працы жывёла, будзе папісаны інвэнтар. Калгаснікі сьвядома абыходзяцца і шануюць жывёлу і інвэнтар.

На веснавыя палявыя работы калгас выходзіць арганізавана. Брыгады ўжо створаны, нормы і расцэнкі выпрацаваны, інвэнтар і цягавая сіла прымацавана да асобных брыгад і калгаснікаў.

У поўнай баявой гатоўнасьці калгас чакае веснавой сяўбы.

Брыгада «Сав. Бел.» А. Дамброўскі, П. Лемяшонак.

Бабруйшчына ганебна цягнецца ў хвасьце

Раён колектывізаваны толькі на 12,6 проц.

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Адсутнасьць сыстэматычнай работы з беднатою ў радзе сельсаветаў раёну, апартуністычная недаацэнка ролі гэтае работы ў барацьбе за новы матутны калгасны прыліў, праваапартуністычная стаўка на самацёк—усё гэта прывяло да таго, што Бабруйскі раён мае значныя прарывы на фронце калектывізацыі. Ня гледзячы на пастановы пленуму раённага камітэту партыі, раённага зьезду саветаў, зьезду калгасаў, які заключыў дагавор па сацспаборніцтву з Аршанчынай на калектывізацыю да пачатку веснавой сяўбы ня менш 35 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, гэтая лічба заістацца далёка ня выканай. Раён ганебна цягнецца ў хвасьце ў справе калектывізацыі; на 10 красавіка раён калектывізаван толькі на 12,6 проц. Сельскія саветы, вясковыя партыйныя арганізацыі не паставілі ў аснову сваёй работы барацьбу за калектывізацыю, правядзімыя гаспадарча-палітычныя кампаніі (кантрактацыя, папулярызацыя адозвы Усебеларускага зьезду саветаў, пастановы Усесаюзнага VI зьезду саветаў), ня здолелі злучыць з непасрэднай работай за арганізацыю калгаснага прыліву.

Каменскі, Гарбацэвіцкі, Лешчанскі і Казуліцкі сельсаветы да гэтага часу маюць усяго 4—7 проц. калектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Але ёсьць яшчэ і горшыя: Падфэцкі, Любоніцкі, Хімоўскі і Продзьвінскі сельсаветы маюць на сёньняшні дзень толькі 1—2 проц. калектывізацыі.

Аб чым сьведчаць гэтыя лічбы? Аб тым, што мясцовыя партыйныя арганізацыі і сельскія саветы праяўляюць у сваёй рабоце праваапартуністычную практыку, не змагаюцца за арганізацыю калгасаў, за выкананьне пляну другой бальшавіцкай вясны.

За апошнюю дэкаду калектывізацыя на раёне паднялася ўсяго толькі на 1 процант, дасягнуўшы такім чынам 13 проц. Гэты рост яскрава паказвае апартуністычнае спадзяваньне на самацёк, адсутнасьць шырокай арганізацыйнай работы.

Надзвычайна слаба скарыстоўваецца ў раёне работа вярбовачных груп. Паводле зьвестак такіх груп на раёне налічваецца 37. Але большасьць груп амаль ніякай работы не праводзяць, а між тым, як паказала практыка Броскага сельсавету, работа іх дае добрыя вынікі ў справе калектывізацыі.

Апартуністычнае спадзяваньне на самацёк з боку раённых і мясцовых арганізацый выразілася і ў тым, што да гэтага часу па раёне зусім ня ўцягнуты ў работу шасьцітысячнікі.

Стварыўшыяся прарывы ў калектывізацыі ставяць перад раённымі партыйнымі, савецкімі, прафсаюзнымі і прамадзкімі арганізацыямі рубам пытаньне аб пераключэньні ўсёй сваёй работы на такія тэмпы, якія-б забясьпечвалі пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне пляну калгаснага будаўніцтва і падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны. Тая мяккасьць, якая праяўляецца з боку раённых арганізацый да вясковых арганізацый, якія праводзяць праваапартуністычную практыку ў сваёй рабоце, вядучы раўнаньне на самацёк, павінна быць у корані зьнішчана.

Бальшавіцкімі тэмпамі, ударнай работай Бабруйскі раён павінен паставіць сябе ў рады перадавых раёнаў БССР па выкананьні пляну калгаснага будаўніцтва. Гэта можа быць забясьпечана шырокай работай з беднатою, шырокай папулярызацыяй пастановы VI Усесаюзнага зьезду саветаў, Усебеларускага зьезду калгасаў, папулярызацыяй вопыту лепшых калгасаў, бязьлітаснай барацьбою з клясавым ворагам—кулаком і яго агентамі—правымі апартуністамі і «левымі» загібшчыкамі.

Д. Аланскі.

Койданоўскі райкалгассаюз, адкажы чаму

з 83-х калгасаў на зьдзельшчыну перайшлі толькі 25!

Перавод калгасаў Койданаўскага раёну на зьдзельшчыну ідзе вельмі марудна. Паводле вестак, якія маюцца ў Райкалгассаюзе, на 13-IV—1931 г. з 83-х калгасаў на зьдзельшчыну перайшло толькі 25 калгасаў. Райкалгассаюз і МТС надзвычайна слаба мабілізавалі сябе па гэту важную работу.

Усім вядома, што зьдзельшчына дае магчымасьць павялічыць прадукцыйнасьць працы і таму неабходна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на пераход калгасаў на зьдзельныя мэтады праці. 25 калгасаў перайшлі на зьдзельшчыну толькі фармальна, фактычна-ж нізодзін з іх не прыступіў да работы. З гэтае прычыны калгаснікі на практыцы ня бачаць карысьці пераходу на зьдзельшчыну а кулакі і падкулачнікі скарыстоўваюць гэта з мэтаю сваёй агітацыі супроць зьдзельшчыны, якая дасьць магчымасьць вынішчыць кулака і гультая з калгасу і палепшыць матар'яльнае становішча калгаснікаў, нанёсшы руйнуючы ўдар па кулаку.

Пост.-брыгадзір газ. «Сав. Бел.» П. І.

21.700 тон і ні кілёграма менш

насеннай бульбы павінна быць адгружана на Украіну і ў Ленінградзкую вобласьць у вызначаны тэрмін

Зводка

адгрузкі насеннай бульбы

ЗА 16-га КРАСАВІКА 1931 г.

За 16-га красавіка адгружана насеннай бульбы для Украіны сыстэмай Белёнсаюзу толькі 15,6 тон.

Другі дзень ударнай адгрузкі насеннай бульбы даў яшчэ горшыя вынікі за першы дзень, калі была адгружана мізэрная колькасьць у 17 тон. Для Ленінградзкай вобласьці насеньня бульбы зусім не адгружаецца.

Усё гэта гаворыць аб тым, што адпаведныя адгрузачныя і загатоўчыя арганізацыі працягваюць ганебна спаць.

Другі дзень адгрузкі сьведчыць аб тым, што прарыў не ліквідаван.

Нельга далей цярпець гэтай сьпячкі.

Насенная бульба павінна быць адгружана поўнасьцю і ў тэрмін.

Кулак ня выконвае заданьня

Загатоўка бульбы па Старасельскім сельсавеце, Колыскага раёну на 9 красавіка выканана толькі на 78 проц. Кулак сабатуе, не адае вызначанай цьвёрдым заданьнем бульбы.

Старасельскі сельсавет павінен дабіцца, каб кулацка-заможныя гаспадаркі зараз-жа поўнасьцю выканалі цьвёрдыя заданьні па загатоўках бульбы.

Я Каган.

Зрываючых загатоўку бульбы—да адказнасьці

Справа з адгрузкай бульбы ў пралетарскія цэнтры знаходзіцца ў вельмі дрэнным становішчы і праца на сёньняшні дзень зусім не разгорнута.

З боку Белёнсаюзу і Белкаапсаюзу наглядаецца поўная бязьдзейнасьць. Як цэнтральныя арганізацыі, так і нізоўкі спадзяюцца на самацёк, не адчуваючы ніякай адказнасьці ва ход загатоўкі і адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам.

Белкаапсаюз адразу пасьля выхіду яго ў ЦКК НК РСІ зрабіў насьпех паседжаньне праўленьня, на якім вынес пастанову аб мабілізацыі некаторай часткі працаўнікоў апарату на раёны па ўзмацненьні загатовак і адгрузкі бульбы. Да гэтага-ж праўленьне БКС ні разу за ўвесь час не заслухоўвала дакладаў аб ходзе бульбазагатовак і адгрузкі. Што-ж да праўленьня Белёнсаюзу, то апошняе абмежавалася толькі фіксаваньнем фактаў. Прычым усе пастановы, так і засталіся на паперы.

У сувязі з такім дрэнным становішчам з загатоўкай бульбы Белсадгародніна [illegible] цытаньне ў Саўнарком [illegible] рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні адгрузкі бульбы ў пралетарскія цэнтры, у прыватнасьці даручыў урадавай чацьвёрцы ўзяць гэту справу пад свой кантроль і адначасова даручыў сваім упаўнаважаным па раёнах, якія знаходзяцца на пасеўкампаніі прыняць актыўны ўдзел у загатоўцы і адгрузцы бульбы.

Сёньня дана распараджэньне ўсім РВК да 25-IV—31 г. выканаць усе нарады па вывазу бульбы на Украіну, у Маскву і ў Ленінградзкую вобласьць.

Б. К. С. і Б. І. С. абавязаны неадкладна даць дырэктывы сваёй нізоўцы.

У сучасны момант маюцца і такія зьявішчы, калі асобныя начальнікі станцый не даюць вагонаў для пагрузкі бульбы. Канкрэтна такія факты мелі месца на ст. Шклоў, Лотва і Б.-Кашалёўская, дзе ня былі даданы вагоны, ня гледзячы на прапанову СНК аб урэгуляваньні гэтага пытаньня. А Касьцюковіцкі РВК не дазволіў вывозіць бульбу ў Маскву і ўхіляецца ад выкананьня нараду па розных прычынах. Толькі апартуністычнай недаацэнкай важнасьці забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў бульбай, можна тлумачыць непадачу вагонаў і забароны ад

Слова — перадавым

Далучымся да закліку рабочых заводаў „КРАСНАЯ ЗАРЯ“, „СВЕТЛАНА“ і „ЭЛЕКТРЫК“, якія выканалі пяцігодку ў два з палавінай гады

Арганізуем 1-га Мая ўсесаюзную эстафэту пераможцаў

„Няхай у дзень 1-га мая з усіх канцоў краіны на Чырвоны пляц у Маскву імчацца рапарты перамог з прадпрыемстваў, капальняў і нафтавых промыслаў, выканаўшых пяцігодку ў 2 з пал. гады

Зварот заводаў „Красная Заря“, „Светлана“ і „Электрык“, выканаўшых пяцігодку ў два з палавінай гады, да рабочых СССР

Заводы «Красная Зара», «Сьветлана» і «Электрык», выканаўшыя пяцігадовы плян у два з паловай гады, зьвярнуліся да ўсіх працоўных СССР з наступным заклікам:

Працэтары Савецкага саюзу!

Надыходзіць міжнароднае рэвалюцыйнае сьвята—1-га мая. **У гэтым годзе сьвята для пралетараў Савецкай краіны супадае з урачыстасьцю практычнага вырашэньня сусьветна-гістарычнай задачы—пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.**

Мы, рабочыя трох перадавых заводаў гораду Ленінграда: «Красная Зары», «Сьветланы» і «Электрыка», разам з нафтавікамі і электразаводцамі сьвяткуем перамогу выкананьня пяцігодкі ў 2 з палавінай гады. Мы выходзім на першамайскі агняд да да другой гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва ў першых радах змагароў за сацыялізм.

Права пераможцаў дае нам, рабочым «Красной Зары», «Сьветланы» і «Электрыка», падставу патрабаваць ад усіх адстаўных у выкананьні пяцігадовага пляну заводаў безадкладнага пераключэньня на баявыя тэмпы.

Мы сёньня перад тварам усяго краіны, перад тварам пралетараў усяго сьвету, бяром на сябе абавязацельства выканаць плян трэцяга, рашаючага году датэрмінова да 14-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, да 7 лі стапада 1931 году, на 2 месяцы раней тэрміну.

Каб больш пасьпяхова вырашыць задачы, мы лічым неабходным у найнаралейшы тэрмін перавесьці на поўны гаспадарчы разьлік усе цэхі і ўдарныя брыгады нашых заводаў. Падтрымліваем пачын рабочых ленінградскага Балтыцкага судабудаўнічага заводу, якія зьвярнуліся да ўраду з просьбай выдаць спэцыяльны закон аб пераводзе брыгад на гаспадарчы разьлік.

Мы заклікаем усе прадпрыемствы, капальні і нафтавыя промыслы, выканаўшыя сваю пяцігодку ў 2½ гады, таксама прыняць на сябе абавязацельства датэрмінова выканаць плян трэцяга, рашаючага году і спаткаць 14-й юбілей пралетарскай рэвалюцыі новай перамогай на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы абавязваемся ў найкарацейшы тэрмін заваяваць тэхніку, прымусіць яе служыць справе пралетарыяту, справе сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі. Канкрэтна мы, красназорцы, сьветланаўцы і электрыкаўцы, дагнаўшыя ўжо па радзе вытворчасьцяй ня толькі Эўропу, але і Амэрыку, даём абавязацельства перагнаць капіталістычную тэхніку ў 1936 годзе, г. зн. у значна больш кароткі тэрмін, чым гэта было пастаноўлена на VI Усесаюзным зьезьдзе саветаў. Каб больш пасьпяхова змагацца за асваеньне перадавой тэхнікі, мы прапануем да першамайскіх сьвятаў выключыць групу лепшых ударнікаў у 200-300 чалавек і накіраваць іх на перадавыя заходня-эўропэйскія і амэрыканскія прадпрыемствы для тэхнічнай вучобы.

Мы прапануем усім рабочым Савецкага саюзу адзначыць першамайскія сьвяты арганізацыяй усесаюзнай эстафэты пераможцаў. Няхай у дзень 1-га мая з усіх канцоў краіны на Чырвоны пляц у Маскву імчацца рапарты перамог з прадпрыемстваў, капальняў, нафтавых промыслаў, выканаўшых пяцігодкі ў два палавінай гады. Мы зварочваемся да ЎсеЦСПС з просьбай безадкладна абмеркаваць нашу прапанову і ўзгадаваць нашу ініцыятыву. Мы просім УсеЦСПС прапрацаваць маршрут эстафэты пераможцаў так, каб перад тым, як прысьці да першамайскага фініту на Чырвоны пляц у Маскву, дэлегаты заводаў, выканаўшых пяцігодку ў 2 з палавінай гады, наведалі рад буйнейшых пралетарскіх цэнтраў краіны, азнаёміўшы ўсіх рабочых СССР са сваімі дасягненьнямі.

Мы прапануем таксама,—і першыя паказаем у гэтым прыклад,—арганізаваць грамадзкі буксір у дапамогу тым прадпрыемствам, якія яшчэ адстаюць у выкананьні пяцігадовага пляну.

За генэральную лінію партыі—да новых баёў за завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне!

Няхай жыве ленінская партыя, якая забясьпечвае сваім кіраўніцтвам выкананьне пяцігодкі ў радзе галін прамысловасьці ня ў 5 а ў 2½ гады!

Па вынікам расьледваньня сьмілавіцкай справы

Пастанова Сакратарыяту ЦК і Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад 1-2—IV-31 г.

1. Адзначыць, што цэнтральны друк правільна сігналізаваў аб фактах заяўму самакрытыкі і ганеньня супроць шэрэспандэнтаў у Дукорах. У рабоце дукорскіх партыйных ячэек (саўгаскай і сельсавецкай) мелі мейсца грубыя правa-апартуністычныя скажэньні і зажым самакрытыкі, што выявілася ў ігнараваньні пастаноў партыі па рабоце з беднатой, у яўным змыканьні і патураньні кулаку з боку шэрагу партыйцаў і засьмечанасьць калгасаў кулацка заможнымі элемэнтамі. Партячэйкі не змагаліся з момантамі нацдэмаўскага выкладаньня літаратуры, антысэмітызмам, вялікадзяржаўным шовінізмам і інш. хваравітамі зьявішчамі ў школе калгаснай моладзі. Ячэйкі дапусьцілі «левыя» загібы ў рабоце, спробы калектывізаваць вёску Харавічы мэтадам давядзеньня цьвёрдых заданьняў да бяднацкіх і серадняцкіх гаспадарак.

2. Дукорская справа выявіла адсутнасьць разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі і слабую мабілізаванасьць Сьмілавіцкай партыйнай арганізацыі на барацьбу з правым і «левым» апартунізмам і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. У практычнай дзейнасьці раду ячэек і зьвеньняў арганізацыі маюць мейсца:

а) у выніку слабага наступленьня на кулацкія элемэнты і невыкананьня дырэктыў партыі аб сыстэматычнай рабоце з беднатой—права-апартуністычны самацёк і недапушчальнае адставаньне ў калектывізацыі, (на працягу году рост калектывізацыі на 3 проц.);

б) засьмечанасьць калгасаў кулацкімі, заможнымі элемэнтамі і «былымі людзьмі»;

в) недастатковае выкананьне раду важнейшых загатовак (лён, мабілізацыя ўсяўлаў, кантрактацыя, камплектаваньне і інш.) і веснавой пасеву кампаніі.

Сакратарыят ЦК і Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б адзначаюць, што РК і РККК слаба змагаліся з апартуністычнымі скажэньнямі партыйнай лініі і правілі ў асобных выпадках прытуленьне клясавай чуласьці і няўменьне разабрацца ў абставінах абвостранай клясавай барацьбы.

3. Утвораная райпракурорам т. Пюдавым, з ведама РК і РККК, паказальная судовая справа над членамі партыі—старшынёю прымясцачковага калгасу «Профінтэрн» т. Лазарчуком, з прадпраўленьнем яму абвінавачваньня ў злачынным [illegible] і ужываючайся в [illegible] пад суд непасрэдных вінаватых чужых элемэнтаў, якія вялі разлагаючую работу ў калгасе—зьяўляецца праяўленьнем грубага адміністраваньня і «левых» загібаў у рабоце суда і пракуратуры, якія песна пераплятаюцца з права-апартуністычнай практыкай у Сьмілавіцкім раёне. Палітычную блізарукасьць, праяўленую Бюро РК, Прэзыдыумам РККК і Райпракурорам у справе Лазарчука—скарысталі клясава-варожыя элемэнты ў барацьбе супроць калектывізацыі.

Сакратарыят ЦК і Прэзыдыум ЦКК рашуча асуджаюць анты-партыйны паступак Лазарчука, як разгаваньне на рашэньне суду замахам на самагубства. Лічыць зусім недапушчальным, што РК і РККК марудзілі ў сваім рэагаваньні на гэтую справу, ня гледзячы на спалітычнае значэньне яе, што клясава-варожыя элемэнты скарысталі ў арганізацыі калгаснай масы супроць пастановы суду.

На падставе гэтага Сакратарыят ЦК і Прэзыдыум ЦКК патстанаўляюць:

1. Прыняць да ведама паведамленьне камісіі, што РК і РККК прынялі пастановы па гэтых справах аб мабілізацыі партыйнай арганізацыі на разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі і правядзеньне генэральнай лініі партыі.

2. Прапанаваць Сьмілавіцкаму РК і РККК правесьці неадкладную работу па растлумачэньню партыйнай арганізацыі, рабочым, калгасным, батрацка-бядняцкім і серадняцкім масам сутнасьці гэтых спраў і прынятых па ім рашэньняў, мабілізуючы іх пад кіраўніцтвам партарганізацыі на рашучае змаганьне з кулаком, зламаўшы яго супраціўленьне, на ачыстку калгасаў ад кулацка-заможных і чужых элемэнтаў, арганізацыі новага прыліву ў калгасах. Паставіць у асяродку ўвагі задачу мабілізацыі ўсіх зьвеньняў рэёну на правядзеньне веснавога севу, на поўную ліквідацыю прарываў у гаспадарча-палітычных кампаніях.

3. РК і РККК забясьпечыць мабілізацыю партыйнай і камсамольскай арганізацыі на правядзеньне ўсіх пастаўленых партыяй задач, рашуча пасіліўшы барацьбу з правым апартунізмам—галоўнай небясьпекай, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі, узмацніць барацьбу з усялякімі скажэньнямі нац. палітыкі партыі, асабліва з вялікадзяржаўным шовінізмам, як найбольш небясьпечным, з нацыянал-дэмакратызмам, антысэмітызмам і інш. шавінізмамі, забясьпечыць пасіленьне тэмпаў беларусізацыі і ачыстку культурна-асьветных і навучальных устаноў ад чужых элемэнтаў.

4. Прапанаваць РК і РККК пасіліць партыйнае кіраўніцтва і кантроль за правядзеньнем чоткай клясавай лініі ў рабоце суду і пракуратуры, ні ў якім выпадку не дапускаючы падмены сабою і апеды над іх работай, забясьпечыўшы ў іх рабоце пасіленьне барацьбы з кулаком і чуждым элемэнтам.

5. Указаць рэд. газ. «Чырвоная Зьмена» на дапушчаную грубую палітычную памылку ў бесдастаўнай кампрамэнтацыі і разаблачэньні юнкора Левіцкага, чым аб'ектыўна газэта стала на шлях заціску самакрытыкі. Лічыць недапушчальным, што рэдакцыя газ. «Чырвоная Зьмена» пасьля правільнай крытыкі памылак «Чырвонай Зьмены» з боку ЦО КП(б)Б «Зьвязда»—не асудзіла сваіх памылак, прапанаваць рэдакцыі асудзіць праз друк сяе памылкі, пасіліўшы арганізатарскую выхаваўчую работу з юнкорамі.

6. Улічваючы, што сакратар Сьмілавіцкага РК КП(б)Б т. Стром, старшыня РККК т. Росьлік—дапусьцілі грубую апартуністычную памылку ў справе Лазарчука і прэмірэнчыя адносіны да апартунізму—зьнять з працы т.т. Строма і Росьліка.

7. Пастанову апублікаваць у друку.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.
Старшыня ЦКК КП(б)Б КАЛІН.

Сваіх пазыцый не здамо

Прамфінплян Магілёўскай швэйнай фабрыкі імя Валадарскага за першую дэкаду выкананы на 102,66 проц.

Агрэгат моладзі выканаў плян на 110 проц., агрэгат Цыцюлюка—на 103 проц., агрэгат Кантара—на 102 проц., агрэгат Літвінава—на 98 проц. Увесь час агрэгат моладзі ішоў наперадзе, таксама і зараз не адстае. Агрэгат Літвінава, які ўвесь час не адставаў на многа ад агрэгату моладзі (Гнесіна) за першую дэкаду аказаўся на апошнім месцы.

Пасьля пасьпяховага завяршэньня 1-а кварталу, рабочыя высунулі сустрэчны прамфінплян, які прадугледжвае замест 671 адзінкі ў агрэгаце—718 адзінак. Але трэба адзначыць, што сустрэчны прамфінплян выкананы толькі на 96 проц. Гэта мы бязумоўна разглядаем, як невыкананьне другога сустрэчнага пляну. Валадарцы абяцаюць надалей ісьці па шляху выканаьня і перавыкананьня другога сустрэчнага прамфінпляну.

Яны ня сьпяняюцца толькі на колькасьці, але пайшлі па шляху палепшаньня якасьці. 11-IV была праведзена канфэрэнцыя па якасьці, дзе намечаны рад канкрэтных мерапрыемстваў па палепшаньні якасьці прадукцыі.

Набойшчыкаў.

На барацьбу за зьніжэньне сабекошту і падвышэньне якасьці прадукцыі

Калі па колькасных паказьніках пляны на прадпрыемствах даводзяцца да кожнага варштата і рабочага, дык у галіне якасных паказьнікаў справа абстаіць значна горш. Прадпрыемствы да гэтага часу па якасных паказьніках ня здолелі давесьці плян калі не да кожнага рабочага, дык хоць-бы да кожнага працэсу вытворчасьці.

Лічбы па зьніжэньні сабекошту за першы квартал 1931 г. гаворыць аб тым, што наогул плянавае заданьне ў 5,4 проц. зьніжэньня сабекошту па прамысловасьці ВСНГ ня выкананы.

Па тэкстыльнай і па мэталяапрацоўчай прамысловасьці ВСНГ зусім ня мае даных за першы квартал 1931 году па якасных паказьніках. Па іншых прадпрыемствах лічбы падаюць наступны малюнак:

Па шкляной прамысловасьці заданьне па зьніжэньні сабекошту, за студзень складае 6,9 проц., а першыя два месяцы даюць рост сабекошту на 13,3 проц. Па запалкавай прамысловасьці—замест плянавых 7,5 проц. па зьніжэньні сабекошту, студзень месяц дае павялічэньне на 3,7 проц., а люты на 2,4 проц. Па фанэрнай вытворчасьці замест плянавых 2 проц. па зьніжэньні сабекошту студзень дае павялічэньне на 13,8 проц., а люты на 13,1 проц.

Ганебныя лічбы даюць завод «Чырвоны Хімік», які замест зьніжэньня сабекошту на 5,5 проц. дае ў студзені павялічэньне на 22,4 проц., а ў лютым на 49,2 проц.

Толькі абойная фабрыка, якая паводле пляну павінна была зьнізіць сабекошт на 9 проц., зьнізіла за студзень 17,3 проц. і ў лютым на 18,2 проц.

Такія нізкія паказальнікі па зьніжэньні сабекошту можна тлумачыць тым, што па першае: у прамфінпляне першага кварталу мы мелі недавыкананьне колькаснай праграмы на 14,6 проц. Другой асноўнай прычынай—гэта пагоршаньне паказьнікаў па працы. Мы маем амаль-што па ўсіх прадпрыемствах рост зарплаты ў некалькі разоў больш, чым рост прадукцыйнасьці працы.

Павялічэньне колькасьці браку бязумоўна мае адбітак на падвышэньні «абекошту па гэтых прадпрыемствах.

Па шкляной прамысловасьці значна вырас процант браку. На фабрыцы «Вэзувій» брак запалак дасягае ў 5 разоў больш, чым гэта вызначана па плёне. Па лямпавым шкле брак на заводзе «Ноўка» павялічыўся ў тры разы.

Павялічэньне сабекошту тлумачыцца таксама падаражэньнем апалу. Перавыдткаваньне апалу асабліва прыкметна па шкляной і запалкавай прамысловасьцях. На заводзе «Ноўка» падаражэньне апалу адбылося на 12 проц.; па заводзе «Ільліч» на 9 проц.

Трэба сказаць, што і перавыдткаваньне сыравіны таксама мае адбітак на якасных паказьніках; па адным толькі Віцебскім скурзаводзе перавыдткаваньне танідыі складае 40 проц.

Такім чынам, лічбы аб зьніжэньні сабекошту па БССР за першыя 2 месяцы першага кварталу сыгналізуюць аб значным прарыве ў якасных паказьніках першага кварталу. Трэба барацьбу за якасныя паказьнікі ўзьняць на тую-ж вышыню, на якую ўзьнята барацьба за колькасныя паказьнікі ў нашай прамысловасьці.

Барацьбой за якасныя паказьнікі павінны заняцца ў першую чаргу тыя прадпрыемствы, якія ў першым квартале даюць ганебныя лічбы. Б. Д.

Чакаюць дырэктыў...

Гэтымі днямі сакратарам кантролю была зроблена праверка выкананьня аб'яднаньнямі Наркамснабу дырэктыў аб пераходзе прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак і ходзе дагаворнай кампаніі.

Выяўлена, што па асноўных аб'яднаньнях Наркамснабу (Белмяса, Саюзхлеб, Белсадгароднінна, Белрыба, Белптушкапрадукт) нават яшчэ не праведзена пастанова СНК аб пераходзе на гаспадарчы разрахунак.

Пры праверцы прыйшлося сустрэцца з поўным неразуменьнем з боку адказных работнікаў самой супасьці гэтых важнейшых мерапрыемстваў. Амаль што ў усіх аб'яднаньнях чакаюць дырэктыў з цэнтру. Самыя аб'яднаньні нават не вызначылі каляндарны плян па дагаворнай кампаніі.

Замест таго, каб добра прапрацаваць маючыся пастановы, асобныя часткі аб'яднаньняў (Саюзхлеб, Белмяса) пакуль-што займаюцца толькі разважаньнямі.

Трэба сказаць што ні ў адным аб'яднаньні Наркамснабу пастановай аб пераходзе на гаспадарчы разрахунак не зацікавілася мясцовыя грамадзкія арганізацыі.

Пара пакласьці канец непатрэбным разважаньням і чаканьням дырэктыў. Пастанову СНК аб пераходзе на гаспадарчы разрахунак трэба выканаць.

З. Левін.

ДЗЕНЬ 1-га МАЯ

правядзем пад знакам мабілізацыі рабочых ва ўдарныя брыгады

Рабочыя заводу „Бальшавік“, „Камунар“ і імя Варашылава, прымеце выклік рабочых абутковай фабрыкі

Выслухаўшы інфармацыю аб падрыхтоўцы да 1-га мая, мы рабочыя Менскай абутковай фабрыкі, абяцаем яшчэ больш прыкласьці ўсе свае сілы на перавыкананьне прамфінпляну II-га кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі, дзень 1-га мая правядзем пад знакам мабілізацыі ўсіх рабочых ва ўдарныя брыгады і сацспаборніцтва.

Мы добра ведаем, як буржуазія рых туецца да 1-га мая, калі ў гэтыя дні будуць пушчаны супроць працоўных усе формы і мэтады белага тэрору. Сотні тысяч пралетараў будуць забіты, паранены і кінуты ў турмы. Сотні і тысячы новых удоў і сірот застануцца пасьля 1-га мая ў краінах капіталістаў.

Мы, рабочыя Менскай абутковай фабрыкі, вітаем пастанову ЦК МОПР'а БССР аб правядзеньні адзначасовага інтэрнацыянальнага першамайскага збору на пабудову інтэрнацыянальных дзіцячых дамоў у СССР для дзяцей зарубежных палітзьняволеных, ўсе, як адзін уносім наш інтэрнацыянальны рубель на гэтую справу і выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу рабочых заводу «Бальшавік», «Камунар», імя Варашылава і ўсіх рабочых мопраўцаў БССР.

Пастанова, прынятая [illegible] абутковай фабрыкі на агульных зьбраньнях сходах 14 і 15 красавіка г.г.

Па-бальшавіцку будзем выконваць прамфінплян

Нядаўна адбылася дэлегацкая канфэрэнцыя рабочых Менскай цукерачнай фабрыкі **«Камунарка»**.

Рабочыя падагульвалі вынікі першага кварталу і намячалі шляхі далейшай барацьбы за палепшаньне якасьці прадукцыі, за зьніжэньне сабекошту, за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады. На гэтай-жа канфэрэнцыі абгаворвалася пытаньне пераходу фабрыкі ў бліжэйшы час ў новае спэцыяльнае памяшканьне.

Прамфінплян першага кварталу фабрыкай выкананы з перавышэньнем у 18,5 проц. Па пасобных цэхах выкананьне наступнае: кармельных цэх — 118,6 проц., мякка-шакаладны цэх—141,9 проц., бісквітны цэх (лічачы толькі 22 дні сакавіка)—98,9 проц.

Плян падняцьця прадукцыйнасьці працы на фабрыцы выкананы ня зусім здавальняюча, усяго на 84 проц.

Што да якасьці прадукцыі, дык тут ёсьць дасягненьні, але ёсьць і рад недахопаў.

Ня зусім добра абстаіць справа з **працдысцыплінай**, на што зьвернута ўвага канфэрэнцыяй. Ёсьць выпадкі, калі наўмысьна ня выходзяць на работу для таго, каб звольніці як прагульшчыка. Удзельнікі канфэрэнцыі выказаліся за тое, каб гэтым эрыўшчыкам выкананьня прамфінпляну аб весьціць байкот і прыняць іншыя меры ўзьдзеяньня.

У зьвязку з гэтым трэба спыніцца на **прагулах**. Прагулы за апошні час прынялі даволі сур'ёзны характар, паступова павялічваючыся. У той час, калі ў студзені было 15 чалавек прагульшчыкаў, дык у лютым іх аказалася ўжо 21, а ў сакавіку яшчэ больш—43 прагульшчыкі. Як бачым, за першы квартал было 79 прагулаў на фабрыцы. Такое становішча далей ня можа быць цярпіма.

Таксама дрэнна справа барацьбы са **стратамі**, якія перашкаджаюць мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Напрыклад, у карамельным цэху не зьбіраюць цьвікі, цукеркі, якія падаюць на падлогу. Вось чаму быў факт, калі аднойчы са сьмецьця выбралі 4 кілё так патрэбных цьвікоў.

Брак на фабрыцы зьмяншаецца. У той час, калі ў асобным квартале браку было 7 процантаў, дык браку маецца толькі больш аднаго процанту. Трэба дабівацца, каб брак быў зусім зьнішчаны.

Зараз трэба спыніцца на становішчы з новай фабрыкай, якая павінна пачаць работу 1 мая. Першы тэрмін пуску новай фабрыкі, абсталяванай па апошняму слову тэхнікі, з новымі машынамі навейшай канструкцыі быў прызначаны на кастрычнік 1930 г., потым гэты тэрмін быў перанесены на 1 студзеня 1931 г. і, нават трэці тэрмін—1 сакавіка таксама сарваўся па цэлым радзе прычын. Зараз ужо адбываецца афарбоўка і пабелка цэхаў.

Трэба адзначыць, што ВЭО (Усесаюзнае Электрычнае Аб'яднаньне) праводзіць добра сваю работу. Дрэнна працуюць **Белдзяржбуд** і **«Энэргія»**. Гэтыя прадпрыемствы марудзяць з устаноўкай пад'ёмніка ў цэнтральнай майстэрні, тым самым затрымліваюць пуск фабрыкі.

Зараз фабрыка мае 2 «вузкіх» месца. Першае—гэта адсутнасьць высока і нізкавольтнага кабеля і, другое, гэта мантаж новай фабрыкі. Машбуд № 2 Масмаштрэста дрэнна адносіцца да мантажа фабрыкі.

І тут ВЭО дапамагло: яно дало высокавольтны кабель, але ён яшчэ не атрыманы дагэтуль з Воршы. Тут яскравы прыклад нядбайнасьці: гэты кабель едзе з Воршы у Менск на працягу... больш 8 сутак!

Трэба было-б адпаведным арганізацыям зацікавіцца гэтым пытаньнем і выявіць вінаватых.

Для новай фабрыкі рыхтуюцца зараз **кадры**. 45 чал. навучаюцца на старой фабрыцы. Трэба, каб яны добра азнаёміліся з новымі машынамі, каб умець імі добра аўладаць.

З пераходам фабрыкі поўнасьцю ў новае памяшканьне ўсе цэхі будуць пераведзены на **гаспадарчы разьлік**.

Пры новай фабрыцы будуецца таксама і сталоўка для рабочых. Але яна ня будзе адкрыта 1 мая ў дзень адкрыцьця фабрыкі, бо Менская кантора Белдзяржбуду не дала дастаткова рабсілы. Пакуль што арганізавана часовая сталоўка.

Паколькі на фабрыцы «Камунарка» большасьць рабочых—жанчыны, дык неабходна пры фабрыцы арганізаваць ясьлі, на што зьвернута ўвага.

На гэтай канфэрэнцыі выказалася шмат рабочых (25 са 120 дэлегатаў). Спрэчкі былі вельмі характарныя. Яны выявілі жаданьне рабочых сапраўды змагацца з усімі і ўсім што перашкаджае выкананьню пяцігодкі ў 4 гады.

— Прагульшчыкі на справе аб'ектыўна выконваюць ролю Рамзінных,—кажа тав. Школьнікаў. Трэба яшчэ больш разгорнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Сапраўдныя ўдарнікі павінны быць перадавікамі ў **перагледзе нормаў выпрацоўкі і расцэнак, каб зьнізіць сабекошт**. Нам трэба аўладаць тэхнікай.

Рабочыя выказаліся за тое, каб кожны цэх меў свой прамфінплян.

На канфэрэнцыі было падана рад рапартаў ад цэхаў і брыгад.

Вучні фабзавучу высунулі сустрэчны плян вучобы: замест 3 год—2 з паловай гады вучыцца і прайсьці тую-ж самую праграму.

Арганізаваны ўдарныя брыгады імя 118 і 1040, імя Горкага і імя Клары Цэткін

Рад таварышоў (Карапачакідзіс і інш.) высоўвалі прапановы, як лепш змагацца з бракам.

Рабочыя «Камунаркі» выклікаюць Магілеўскую, Гомельскую, Бабруйскую цукерачныя фабрыкі і Менскі хлебазавод рэалізаваць адозву тульскіх рабочых, з свайго боку высоўваючы свае прапановы.

Шмат брыгад падпісалася дадаткова на пазыку (брыгада Карапачакідзіса і інш.). Агулам падпіска дасягнула на фабрыцы 5.100 руб. Брыгада адліўшыц у ліку 10 чал. падпісалася на новую пазыку «Трэці рашаючы» на 375 руб.

На працягу работы канфэрэнцыі было падана многа заяў з боку рабочых і работніц аб уступленьні ў партыю і ў камсамол.

Канфэрэнцыя паказала, што рабочыя і работніцы «Камунаркі» ўзяліся з бальшавіцкімі тэмпамі выканаць свой прамфінплян.

Л. Пал.

Ісьці ў нагу з пралетарыятам пад кіраўніцтвам партыі

Разам з вялізарнымі дасягненьнямі на ўсіх участках нашага гаспадарчага будаўніцтва і на падставе іх мы маем вялізарныя дасягненьні і ў галіне будаўніцтва культуры—нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце. Посьпехаў у галіне культурнага будаўніцтва мы дасягнулі толькі на падставе няўхільнага правядзеньня ленінскай нацыялітыкі ў рашучых баёх з вялікадзяржаўным шавінізмам,—галоўнай небясьпекай,—з контррэвалюцыйным беларускім нацдэмакратызмам і шавінізмам іншых адценьняў.

Вялізарная роля ў справе разьвіцьця сацыялістычнай культуры належыць 1-му Беларускаму Дзяржаўнаму тэатру, 10-гадовы юбілей якога сьвяткуецца працоўнымі БССР.

Гэты тэатр узьнік разам з аднаўленьнем савецкай улады на Беларусі пасьля вызваленьня ад белапалякаў. Белдзяржтэатр заснаваўся з трупы акторaў беларускага драмгуртка ў 1920 годзе і з 1921 г. пачаў існаваць не ў якасьці «Беларускага Акадэмічнага тэатру».

Усё культурнае будаўніцтва БССР наогул, а ў тым ліку і разьвіцьцё тэатру і ў прыватнасьці 1-га Белдзяржтэатру, праходзіла на фоне абвостранай клясавай барацьбы. Клясавы вораг у сваіх варожых пралетарыяту мэтах імкнуўся накіраваць разьвіцьцё нацыянальна-культурнага будаўніцтва Беларускага тэатру па шляху культуры нацыянальнай па форме і буржуазнай па зьмесьце,—па шляху буржуазнай культуры і гэта часам яму ўдавалася (пастаноўкі «Тутэйшыя», «Апраметная» і інш.). Контр-рэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты, карыстаючыся тым, што ў Наркамасьветы, які кіраваў тэатрам, было нацдэмаўскае кіраўніцтва, нацдэмаўскае засільле,—імкнуліся ператварыць тэатр у зброю для прапаганды сваёй контррэвалюцыйнай нацдэмаўскай ідэалёгіі.

Пастаноўкі «Чырвоная маска», «Каваль вяводы», якія пры буйных недахопах усё-ж былі крокам тэатру наперад у сэнсе служэньня інтарэсам рабочае клясы і працоўных, сустракаліся контр-рэвалюцыйнымі нацдэмамі ў штыхі. Яшчэ большым лямантам контррэвалюцыйныя нацдэмы сустрэлі пастаноўкі БДТ-1 «Мост», «Мяцеж» і «Броняцягнік». Усім памятна вядомая тэатральная дыскусія, якая зьявілася ў выніку абвастрэньня клясавай барацьбы і якая пачалася з барацьбы вакол пастаноўкі тэатрам «Броняцягніка», які зьяўляецца паказам гераічнага змаганьня пралетарыяту за перамогу Кастрычніка. Тэатральная дыскусія больш чым яскрава паказала сапраўдныя контр-рэвалюцыйныя імкненьні і намеры беларускіх нацдэмаў, іх арыентацыю на капіталістычны захад. Рабочая кляса і ўся савецкая грамадзкасьць пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі з усёй рашучасьцю ўдарылі па нацдэмах. Партыя выкрыла клясавую сутнасьць тэорыі «самабытнасьці», якую прапаведвалі контррэвалюцыйныя беларускія нацдэмы.

Рашучы адпор, які атрымалі нацыянал-дэмакраты, жорсткая пралетарская крытыка палітычных памылак тэатру, бязумоўна дапамаглі тэатральнаму калектыву 1-га Беларускага Дзяржаўнага тэатру стаць на правільны шлях і сваю работу падпарадкаваць інтарэсам нашага сацыялістычнага будаўніцтва (пастаноўкі «Цута», «На лініі агню» і інш.). Тэатр зьвязаўся з рабочымі масамі і сваімі апошнімі пастаноўкамі выконвае сацыяльны заказ пралетарыяту. БДТ-1 у справе свайго ператварэньня ў сапраўдны пралетарскі тэатр мае досыць значныя дасягненьні.

10-гадовы юбілей БДТ-1 адзначае ўся рабочая кляса і ўсе працоўныя БССР. Юбілей БДТ-1 супадае з часам вялізарных сацыяльна-эканамічных зрухаў у нашай краіне, супадае з часам завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Гэта ўскладае на калектыў тэатру асабліва адказныя задачы.

Ісьці ў нагу з пралетарыятам пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі—генэральная задача калектыву ЕДТ.

З.

Да X-годзьдзя Першага Белдзяржтэатру

СНК БССР узнагародзіў граматай Першы Белдзяржтэатр

У грамаце СНК БССР гаворыцца:

У барацьбе за культурную рэвалюцыю пралетарыят БССР пад выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі дасягнуў вялізарных посьпехаў. Гэтыя посьпехі пралетарыятам дасягнуты ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы.

Буржуазна - кулацкі контр-рэвалюцыйны нацыянал - дэмакратызм сваю шкодніцкую дзейнасьць накіраваў у першую чаргу на ідэалёгічны фронт, імкнучыся разьвіцьцё пралетарскай культуры і пралетарскага мастацтва накіраваць на шлях буржуазнай культуры, утварыўшы для гэтага сваю тэорыю кулацка - абшарніцкай «самабытнасьці». Такія буржуазныя ідэі нацыянал - дэмакраты імкнуліся ажыцьцявіць і ў працы нашых тэатраў, але іх разьлікі знайсьці апору для ажыцьцяўленьня сваіх кулацкіх установак не знайшлі падтрымкі з боку абсалютнай большасьці працаўнікоў мастацтва (тэатраў) і іх стаўка была біта. Працаўнікі мастацтва ў сваёй асноўнай масе зьвязалі свой лёс з пралетарыятам і пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі працуюць над мастацкім афарбленьнем эпохі бурнага сацыялістычнага росту нашай краіны.

На падставе шпаркага разьвіцьця ў БССР сацыялістычнай эканомікі з посьпехам разгортваецца культура сацыялістычная па зьместу і нацыянальная па форме. Вялізарная роля ў справе разьвіцьця сацыялістычнай культуры, у падпарадкаваньні адзнае з яе важнейшых галін—мастацтва справе сацыялістычнага будаўніцтва належыць і БДТ-1, які ўжо даказаў гэта шэрагам сваіх новых пастановак.

Перад калектывам тэатру стаяць вялікія задачы ў справе далейшага разгортваньня і паглыбленьня свае работы. Шпаркія тэмпы індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі патрабуюць ад калектыву тэатру вельмі напружанай работы па разгортваньні пралетарскага мастацтва, па набліжэньні тэатру да шырокіх рабочых мас, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і ўсіх працоўных БССР.

Савет Народных Камісараў БССР заклікае працаўнікоў тэатру да далейшай пасьпяховай працы за бальшавіцкае выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва і ўзмацненьне пралетарскай дыктатуры, за правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі вядучы рашучую барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнаю небясьпекаю на даным этапе, з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмам іншых колераў.

Вялікі саюз

рэвалюцыйнай навукі і рэвалюцыйнай працы

Са звароту ўсесаюзнай канфэрэнцыі па плянаваньні навуковай работы да пралетараў і сумленных вучоных сьвету

Першы раз у сьвеце сабраліся ў сталіцы пралетарскай дыктатуры буйнейшыя навуковыя сілы вялікай краіны, радавыя працаўнікі навукі і тэхнікі, будаўнікі новых прамысловых гігантаў і сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, рабочыя-ўдарнікі і адважныя атрады камсамольскай моладзі, каб у маштабе сваёй пралетарскай бацькаўшчыны, якая зьяўляецца бацькаўшчынай міжнароднага пралетарыяту, закласьці фундамант пляну навукова-дасьледчых работ.

Вялікая будоўля ідзе ў нашай краіне, уступіўшай у пэрыяд сацыялізму, у краіне гераічнага напружаньня сіл, нячуваных матчымасьцяй, вялізарнай натхнёнай творчасьці мільённых мас. Толькі зараз, пад жывым узьдзеяньнем гарачай сацыялістычнай працы, выяўляюцца скрытыя навычарпальныя багацьці Саюзу.

Усе «акраіны», усе калёніі былой імпэрыялістычнай дзяржавы становяцца на свае моцныя маладыя ногі. А ў старых мясцох скапленьня пралетарыяту, у Маскве, Ленінградзе, Харкаве, б'ецца гарачае сэрца ўзрастаючага сацыялістычнага волата. Толькі зараз пачалося сапраўднае вывучэньне нашай краіны, і толькі нязначная частка каштоўных таемніц выкрыта яе будаўнікамі. З вялізарным размахам, з вялікай радасьцю мы будзем здабываць гэтыя таямніцы, аддаючы іх у рукі нашага гераічнага пралетарыяту.

Мы будзем актыўна дапамагаць найвялікшаму ў гісторыі будаўніцтву. Усе сілы, усе веды, усё ўменьне мы будзем аддаваць творчасьці мільённай працоўных, якія перабудоўваюць краіну на сацыялістычны лад.

Пралетарыят, кляса—кіраўнік, кляса—арганізатар, кляса—творца, перарабляе ў нашай краіне і сваю ўласную прыроду і **прыроду ідучых за ім працоўных мас.**

**Мы заяўляем, што будзем ісьці ў радох гэтай клясы ўсімі сіламі і да канца ва ўсіх гістарычных выпрабаваньнях, падтрымліваючы яго жалезную дыктатуру, выводзячую чалавецтва на новыя шляхі сусьвет

Гарсавет--дэпутацкая група--
скразная ўдарная брыгада
На нарадзе пры рэдакцыі газ. „Савецкая Беларусь“

16 красавіка пры рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» адбылася нарада па пытаньні работы дэпутацкіх груп.

Адкрываючы нараду прадстаўнік рэдакцыі ў кароткіх рысах ахарактарызаваў тое дрэннае становішча з разгортваньнем работы дэпутацкіх груп, якое маецца ў БССР, застанавіўся на апартуністычнай недаацэнцы тэтай важнейшай справы з боку нізавых партыйных і прафсаюзных арганізацый і высунуў рад прапаноў для забесьпячэньня карэннага пералому ў гэтай ра боце.

З прамовай выступіў адказны сакратар т-ва дзяржаўнікаў - марксыстаў тав. Канаплін, які падрабязна застанавіўся на становішчы і далейшых шляхох, па якіх павінна ісьці савецкая работа на прадпрыемствах.

Пасьля прамовы тав. Канапліна разгарнулася спрэчкі.

Забясьпечыць гарсавет належным інструктарскім штатам
Тав. Валодзька (старшыня Менгарсавету)

— Дэпутацкія групы—як новая форма савецкай работы павінны быць шырока разгорнуты і даць адпаведныя вынікі.

Перад дэпутацкімі групамі стаяць задачы ня толькі вытворчыя, але і агульныя--будаўніцтва сацыялізму. Ячэйкі савецкай улады, якімі зьяўляюцца дэпутацкія групы павінны займацца ня толькі прамысловасьцю, але і пытаньнямі гарадзкога будаўніцтва, гарадзкога бюджэту і г. д

Мы часам пачынаем тое ці іншае будаўніцтва, укладваем пэўныя сродкі, на ват будуем і толькі пасьля гэтага аказваецца, што зроблена памылка. Чаму так здараецца? Таму, што мы часам ня ведаем думкі рабочае грамадзкасьці наконт таго ці іншага нашага мерапрыемства. Калі-ж дэпутацкія групы таксама будуць займацца ўсімі гэтымі пытаньнямі, абгаворваючы асноўныя пастановы і меркаваньні Гарсавету сярод рабочых, дык памылак у будаўніцтве ў разьмеркаваньні сродкаў і ў іншых галінах нашае работы будзе значна менш, яны зьніччацца.

Калі дэпутацкія групы і савецкі актыў будуць ведаць, што іх работа дае пэўныя практычныя вынікі, што іх пастановы ажыцьцяўляюцца ,дык яны набудуць пэўны аўтарытэт сярод рабочых і хутчэй абрастуць актывам.

Я зусім згодны з тым, што значным тормазам у разгортваньні дэпутацкіх груп зьяўляецца адсутнасьць належнага інструктажу і кіраўніцтва з боку Менгарсавету.

Але і ў нас маюцца дрэнныя ўмовы. У нас няма дастатковай колькасьці штату і грамадзкіх інструктароў. Разам з тым, у Менску маюцца значныя невыкарыстаныя рэзэрвы для гэтай работы. Напрыклад—факультэт савецкага будаўніцтва і права. Студэнты гэтага факультэту могуць, з вялікай карысьцю для нас і для іх самых, быць прыцягнуты ў якасьці грамадзкіх інструктароў да ўдзелу ў стварэньні і наладжваньні дэпутацкіх груп.

Гэта мерапрыемства неабходна правесьці ў самы бліжэйшы час. Я лічу таксама неабходным правесьці кароткатэрміновыя курсы—канфэрэнцыі для бюро дэпутацкіх груп і савецкага актыву.

Мы яшчэ таксама ня выкарысталі маючыся ў Менску вельмі значныя навуковыя сілы для тэарытычнага, навуковага ўпрыгтаваньня нашай работы.

Трэба адзначыць, што і з боку другога няма яшчэ належнай увагі да ўсяе нашай работы наогул і дэпутацкіх груп у прыватнасьці. Між тым, друк павінен быць нашым лепшым дапаможнікам і шляхам крытыкі недахопаў, мясцовым абгаварэньнем нашай работы дапамагчы падняць яе на належную вышыню.

Аргаддзел ЦВК не займаўся работай дэпутацкіх груп
Тав. Сухараў (газ. „Рабочий“)

— Аб правох дэпутацкіх груп трэба гаварыць менш за ўсё. Дэпутацкая група гэта па-першае прывадны рамень між гарсаветам і масай.

Упор у рабоце дэпутацкіх груп павінен быць на вытворчыя пытаньні. Але побач з гэтым дэпутацкія групы павінны імкнуцца ахапіць сваёй дзейнасьцю і іншыя галіны сацыялістычнага будаўніцтва: культура, быт, мабілізацыя сродкаў, камунальная гаспадарка, рабочае забесьпячэньне і г. д.

Што-ж да ўзаемаадносін дэпутацкіх груп з фабкомам, парткалектывам і інш. арганізацыямі, дык плян работы групы трэба распрацаваць так, каб ня было ўзаемных перашкод.

Ня змазваць сутнасьці дэпутацкіх груп
Тав. Шалкавец (сакратар Менгарсавету)

Дагэтуль з боку грамадзкасьці, нізавых партыйных і прафсаюзных арганізацый яшчэ няма належнай увагі арганізацыі і работы дэпутацкіх груп.

Аб гэтым сьведчыць, хоць-бы той факт, што на заводзе імя Варашылава, друкарні імя Сталіна і іншых прадпрыемствах неаднаразова зрываюцца арганізацыйныя сходы.

Мы яшчэ ня маем вялікага вопыту ў разгортваньні работы дэпутацкіх груп, а той вопыт, які ёсьць незбагулены. Неабходна арганізаваць абмен вопытам паміж лепшымі і горшымі групамі шляхам грамадзкага буксіру і вечароў-сустрэч паміж дэпутацкімі групамі.

На некаторых прадпрыемствах наглядаюцца неразуменьне ўзаемаадносін паміж работай дэпутацкіх груп і іншымі фабрычна - заводзкімі арганізацыямі. На гэтых прадпрыемствах ба яцца, каб работа дэпутацкай групы не дублявала работу іншых арганізацый. Я лічу, што гэта боязьнь зьяўляецца нічым іншым як змазваньне сутнасьці дэпутацкіх груп прыкрыцьцем апартуністычных адносін да іх арганізацыі. Ні ў якім разе ня трэба баяцца таго, што дэпутацкія групы захопяць «чужыя» функцыі.

Чужых функцый няма, ёсьць адзіная задача. Дэпутацкія групы на прадпрыемствах будуць таксама біцца за выкананьне і перавыкананьне прамфін пляну, далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва. Дэпутацкія групы разам з фабрычна - заводзкімі арганізацыямі будуць пад кіраўніцтвам партячэек займацца вырашэньнем задач, стаячых перад даным прадпрыемствам.

Прымацаваць да кожнай дэпутацкай групы інструктара ў парадку сацсумяшчэньня
Тав. Адамчук (ЦВК)

— Ва ўмовах БССР дэпутацкія групы — справа новая. Да апошняга часу мы ня мелі ўласнага вопыту ў гэтай рабоце. Мы яшчэ топчамся на адным месцы.

Цяпер, маючы некаторы вопыт работы «Бальшавіка» і інш. прадпрыемстваў, трэба як мага хутчэй перанесьці яго на ўсе астатнія прадпрыемствы БССР.

Абгаварваючы формы работы дэпутацкіх груп трэба сказаць, што тут не справа ва ўзаемаадносінах, як некаторыя таварышы думаюць. Дэпутацкія групы ў першую чаргу павінны стаць сродкам сапраўднага паваротту гарсавету тварам да вытворчасьці, да мас.

У гэтай галіне трэба дабіцца, каб Менскі Гарсавет стаў узорным.

Для практычнага кіраўніцтва дэпутацкімі групамі неабходна да кожнай з іх замацаваць грамадзкіх інтруктароў, якія павінны дапамагаць ім у складаньні плянаў работы і ў выкананьні штодзенных задач.

Адзначаючы ініцыятыву **«Савецкай Беларусі»** ў скліканьні сёньняшняй нарады, я лічу неабходным працягваць скліканьне такіх нарад надалей.

Парт'ячэйка павінна кіраваць, а не падменьваць дэпутацкую групу
Тав. Нахамава (гарбарня „Бальшавік“)

— На арганізацыйным сходзе мы абралі бюро дэпутацкай групы ў колькасьці 5 асоб.

Бюро зьбіраецца 2-3 разы ў месяц, абмяркоўвае праробленую работу і выпрацоўвае заданьні надалей. На заводзе ўведзены спэцыяльны савецкі дзень, у які зьбіраецца ўся група.

Для нашай работы патрэбен быў плян. Парткалектыў, між іншым биз удзелу дэпутацкай групы, выпрацаваў і прадставіў нам плян, па якім мы і працуем.

У бліжэйшыя 3 месяцы мы мяркуем правесьці наступную работу: абсьледаваць становішча па мабілізацыі сродкаў на нашым заводзе (дзейнасьць кам соду, аддзяленьне ашчадкасы і г. д.); праверыць работу закрытага разьмеркавальніка (разьмеркаваньне дэфіцытных тавараў і інш.) і абсьледаваць работу нашай сталоўкі.

Усе гэтыя мерапрыемствы мы праводзім пры дапамозе арганізаваных дэпутацкай групай брыгад, якія пасьля выкананьня заданьняў робяць справаздачы на агульных сходах рабочых.

Няма кіраўніцтва дэпутацкай групай
Тав. Купярштох (фабрыка „Камунарка“)

— На нашай фабрыцы дэпутацкая група створана нядаўна. Для кіраўніцтва работай групы абрана бюро з 3-х асоб.

Да гэтага часу мы яшчэ не разгарнулі работы і абмежаваліся толькі абгаварэньнем пытаньня папярэдняй пад піскі на пазыку «трэці рашаючы».

Навізна справы і адсутнасьць больш ці менш выстарчальнага інструктажу з боку Гарсавету не дазваляе паставіць работу дэпутацкай групы на належную вышыню.

Нарада парашыла

Пасьля спрэчак нарада перайшла да прыняцьця канкрэтных прапаноў па далейшым разгортваньні работы дэпутацкіх груп.

Нарада палічыла патрэбным паставіць перад усімі гарсаветамі задачу шырокага разгортваньня інструктажу дэпутацкіх груп, выкарыстаўшы для гэтай мэты грамадзкіх інструктароў, прыцягваючы ў іх студэнтаў факультэту савецкага будаўніцтва і права.

Для абгаварэньня форм і мэтадаў работы дэпутацкіх груп лічыць мэтазгодным працягваць надалей нарады накшталт скліканай газэтай «Савецкая Беларусь».

Паставіць перад ЦВК пытаньне аб рэарганізацыі часопісу «Саветы Беларусі», ў сапраўдны баявы орган Саветаў, які быў-бы зьвяном, здольным за няць адно з першых месц у рабоце па перабудове работы Саветаў тварам да вытворчасьці і калгаснага будаўніцтва.

У мэтах абмену вопыта і папулярызацыі работы дэпутацкіх груп практыкаваць вечары сустрэч дэпутацкіх груп паасобных прадпрыемстваў.

У майскія дні правесьці ўсебеларускую радыё-пераклічку Гарсаветаў аб рабоце дэпутацкіх груп;

Арганізаваць праз друк усебеларускі рапарт-пераклічку аб дзейнасьці савецкіх груп.

Для азнаямленьня з вопытам работы гэтай галіны ў іншых гарадох СССР хутчэй накіраваць брыгады лепшых ударнікаў-дэпутатаў Гарсаветаў, згодна маючыхся пастаноў, у Маскву, Харкаў, Растоў-Дон і інш.

Арганізаваць кароткатэрміновыя курсы-канфэрэнцыі для бюро дэпутацкіх груп і савецкага актыву.

***

Рэдакцыя газ. «Савецкая Беларусь» зьмесьціць у бліжэйшы час рад артыкулаў па пытаньнях савецкай работы і практычнай дзейнасьці дэпутацкіх груп.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ УРАДУ БССР

Пастанова
Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену арт. 24 Грамадзянскага Працэсуальнага Кодэксу і пра дапаўненьне гэтага кодэксу артыкулам 179-а.

У адпаведнасьці з пастановаю ЦВК і СНК Саюзу ССР за 4 сакавіка 1931 г. «Пра ліквідацыю арбітражных камісій» і пастановаю ЦВК і СНК БССР аз 25 сакавіка 1931 г. «Пра ліквідацыю Арбітражнай Камісіі пры Эканамічнай Нарадзе БССР» Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Арт. 24 Грамадзянскага Працэсуальнага Кодэксу запісаць у наступнай рэдакцыі:

«24. Вярхоўнаму Суду па грамадзянскай судовай калегіі падсудны:

а) справы па ісках да народных камісарыятаў альбо прыроўненых да іх цэнтральных устаноў;

б) справы па спрэчках паміж дзяржаўнымі ўстановамі і прадпрыемствамі, якія знаходзяцца на тэрыторыі БССР, апроч справ, падсудных паводле спэцыяльных законаў, Вярхоўнаму Суду Саюзу ССР, а таксама спрэчак паміж установамі і прадпрыемствамі аднаго ведамства;

в) справы аб немаемнасьці каапэратыўных арганізацый рэспубліканскага га значэньня, а таксама аб немаемнасьці дзяржаўных прадпрыемстваў рэспубліканскага і мясцовага значэньня і акцыйных таварыстваў, зарэгістраваных ўстаноўленым парадкам.

2. У арт. 10 паказанай пастановы скасаваць словы:

«Памянёныя ў гэтым артыкуле асобы ня могуць быць выселены ў пэры яд з 1-га лістапада да 1-га красавіка».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

5 красавіка 1931 г.
г. Менск.

Пастанова
Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра дапаўненьне п. «з» арт. 1 і зьмену арт. 10 пастановы «пра ўмовы і парадак высяленьня грамадзян з занятых імі памяшканьняў у гарадох і мястэчках.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Дапоўніць арт. 1—пастановы ЦВК і СНК БССР за 19 лютага 1927 г. «Пра ўмовы і парадак высяленьня грамадзян з занятых імі памяшканьняў у гарадох і мястэчках» (З. З. БССР 1927 г. № 12, арт. 42) п. «з» у наступнай рэдакцыі:

«з) калі муніцыпалізаваны дом ці кватэра ў такім доме патрэбны для дзяржаўных або грамадзкіх патрэб. Установы ці арганізацыі, якой патрэбна памяшканьне, павінна даць асобе, што перасяляецца, годную для жыльля кватэру, калі жылец належыць да катэгорыі асоб, паказаных у арт. 7 гэтае пастановы».

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

ПРА АСЛАБАНЕНЬНЕ ТАВ. СТАНЬКОЎСКАГА, М. У., АД АБАВЯЗКАЎ ЧЛЕНА ПРЭЗЫДЫУМУ ВСНГ І ПРА НАЗНАЧЭНЬНЕ ТАВ. САКАЛЕНКА, А. А., ЧЛЕНАМ ПРЭЗЫДЫУМУ ВСНГ

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Аслабаніць т. Станькоўскага, Мікалая Ўладзімэравіча, ад абавязкаў члена Прэзыдыуму ВСНГ.

2. Назначыць т. **Сакаленка**, Александра Аронавіча, членам Прэзыдыуму ВСНГ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **С. Кандыбовіч.**

14 красавіка, 1931 г.
г. Менск.

Зводка
аб ходзе дагаворнай кампаніі па Белпаліграфаб'яднаньні

На сёньняшні дзень Белпаліграфаб'яднаньнем заключаны наступныя ўмовы:

1) З Белдзяржвыдавецтвам заключана генэральная ўмова на 1931 г.,

Па шпалернай фабрыцы імя т. Вароўскага—Менск, заключаны наступныя ўмовы:

1) З Белдзяржснабам па рэалізацыі прадукцыі і другая па забесьпячэньні таксама з Белкаапсаюзам.

Адначасова ёю накіраваны (Ленінград, Масква і Харкаў) праекты ўмоў для заключэньня.

Сёньня-ж накіраваны ад аб'яднаньня дырэктар шпалернай фабрыкі для заключэньня ўмовы на паперу з ф-кай «Чырвоная Зорка»—Чашніцы па Палесдруку—Гомель.

Заключаны дагавары:

1) З Наркампаштэлем на выраб прадукцыі на 1 млн. руб.

2) З Оргбудам і

3) з Гомбудаб'яднаньнем на пабудову 3-га паверху Палесдруку.

Белпаліграфаб'яднаньне.

16-IV-31 г.

ПАСТАНОВА № 5-102
Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

1 красавіка 1931 г.

Менскі Гарадзкі Савет пастанаўляе:

1. Артыкул першы разьдзелу 9. (льготы платнікам) палажэньня аб кватэрнай плаце, зацьверджанага пастановай Менскага Гарадзкога Савету ад 16 мая 1929 г. за № 106 дапоўніць наступным пунктам:

„3) Чырвоным партызанам, чырвонагвардзейцам і былым паліткатаржанам, які знаходзяцца ў таварыс ве б. паліткатаржан, пры вылічэньні кватэрнай платы прадастаўляецца скідка ў 50 проц.“

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету **Валодзька.**
Сакратар Гарадзкога Савету **Шалкавец.**

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ
(Ад нашых карэспандэнтаў па тэлеграфу і тэлефону)

Справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці па Мялешкаўскім сельсавеце, Ельскі раён, абстаіць вельмі дрэнна. У вёсцы Мялешкавічы налічваецца 213 чалавек няпісьменных, а наведваюць ліквпункты ня больш 50. Сельсавет зусім ня цікавіцца работай ліквпунктаў. Між тым, у ліквпунктах часта зьмяняюцца дні заняткаў, апошнія часта зрываюцца з-за сходаў, якія адбываюцца ў памяшканьні, дзе працуюць ліквпункты. Зрываюцца заняткі і з-за таго, што не хапае газы. Праўда, газа прывозіцца ў краму, але крамніку забаронена даваць яе ліквпунктам і школам (?!).

Вінаваты ў зрыве ліквідацыі няпісьменнасьці павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Калгас «Савецкая Беларусь» (Сьмілавіцкі раён) поўнасьцю падрыхтаваны да другой бальшавіцкай вясны. Сельска-гаспадарчы інвэнтар адрамантаваны, плянны прапрацаваны, насеньне ачышчана. Калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі на лепшае правядзеньне другой бальшавіцкай сяўбы, у калгасе арганізаваны ўдарныя брыгады, якія па ўдарнаму прыступілі да работы.

У апошніх днёх сакавіка ў Заслаўшчыне адбыўся пробны выезд у поле. Пробны выезд у поле паказаў, што да 2-й бальшавіцкай сяўбы некаторыя саўгасы і калгасы падрыхтаваліся, як належыць. Калгас «Сталіна» Траскоўскага сельсавету, калгас «Кім», Слабодзкага сельсавету, калгас «Камінтэрн», Старасельскага сельсавету ачысьцілі ўсё сваё насеньне, адрамантавалі ўвесь сельска-гаспадарчы інвэнтар, адрамантавалі свой транспарт і пробным выздам даказалі, што сяўбу правядуць па-бальшавіцку.

Выратаваць лесаматар'ял ад паводкі. Надыходзячая паводка, разьліў Зах. Дзьвіны стаіць пад пагрозу зносу вадой 11.500 кубамэтраў экспартнага лесу і 5 тысяч кубамэтраў будаўнічага мясцовага лесаматар'ялу. Увесь гэты лес знаходзіцца на шасьці румох, разьмешчаных на Дзьвіне і на невялічкай р. Сосьніцы. Асаблівая паводка пагражае румам Карпенічы і Якубава, на якіх знаходзіцца каля паловы ўсяго вышэйпаказанага матар'ялу.

Ня гледзячы на тое, што мясцовая раённая газэта «Чырвоная Полаччына» сыгналізавала аб пагражаючым становішчы, усё-ж такі дастатковых мер да абароны лесу ад паводкі ня прынята. У лесапрамгасе па-ранейшаму існуе блытаніна адсутнасьць чоткіх дзеяньняў. Снасьці, крэпы і інш. спэцыяльныя матар'ялы для работы на румох дастаўляюцца з вялікай запаволкай. Між тым, вясна не чакае. Паводка можа застаць румы непадрыхтаванымі і тады замест моцна зьвязаных плытаў Дзьвіна панясе бэлькі, разбурыць румы і сарве плянавы сплаў сёлетняй вясны.

Злачынная маруднасьці ў справе выратаваньня лесу ад паводкі не павінна быць. Лесапрамгас павінен прыняць неадкладныя крокі, каб не дапусьціць зносу. Тых, хто імнаруе сыгналы другу, трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Дэкада штурму за здаровы паравоз. 11 красавіка па ўсіх цэхах дэпо Гомель—гаспадарчы былі праведзены мітынгі, на якіх рабочыя дэпо, вітаючы пастанову гаркому партыі аб зьмене апартуністычнага кіраўніцтва дэпо, пастанавілі абвясьціць дэкаду штурму за здаровы паравоз.

З 12 красавіка дэкада штурму пачалася. Рабочыя з вялікім уздымам б'юцца за здаровы паравоз.

Зрываюцца заняткі на шасьцімесячных настаўніцкіх курсах пры Дукорскай сямігодцы (Сьмілавіцкі раён). Большасьць дысцыплін, як родная мова з мэтодыкай, пэдагогіка, пэдалёгія і інш. не выкладаюцца на курсах.

Райнспэктар нарасьветы, ведаючы аб прывожным становішчы на настаўніцкіх курсах, ніякіх захадаў ня прымае і ўпадзяецца на самацёк.

Курсы спыняюць ужо зусім заняткі і стаяць напярэдадні распаду. Наркам асьветы трэба прыняць тэрміновыя захады, каб не сарваць падрыхтоўкі кадраў для ўсеагульнага навучаньня.

Дэлегацыя французкіх рэвалюцыйных каапэратыўаў на фабрыцы «Настрычнік» у Менску.

З лістоў рабселькораў

Большасьць настаўнікаў Касьцюковіцкай школы калгаснай моладзі амаль ня ўжывае беларускай мовы. Гэта тлумачыцца нічым іншым, як праявай вялікадзяржаўнага шавінізму, па якім трэба моцна біць.

К. Т.

Яшчэ ў мінулым годзе загатавалі для пабудовы школы ў Абчузе (Чарэйскі раён) лесаматар'ял; частку яго вывезьлі на месца пабудовы, а большасьць ляжыць яшчэ ў лесе. Калі так застанецца лесаматар'ял яшчэ на год, дык тады ніякай школы не пабудуеш, бо ён загніе.

Абчугскі.

Работа ліквпунктаў у Старасельскім сельсавеце (Копыскі раён) у заняпадзе. Ліквпункты не абсталяваны, не забясьпечаны падручнікамі і паперай. Ліквідатары часта не наведваюць ліквпункты і дрэнна абыходзяцца з вучнямі. Усё гэта выклікае адліў з ліквпунктаў.

А. Генін.

Пры калгасе «Вольная Беларусь» (Слуцкі раён) існуе аднакамплектная школа. Нажаль, праўленьне калгасу не дапамагае зусім школе,—не дала нават адпаведнага памяшканьня. Дрэн на ў школе справа і з інвэнтаром.

Праўленьне калгасу павінна дапамагчы школе.

К. Віньнік.

Загадчык Бялёўскай школы (Жыткавіцкі раён) тав. Майкевіч ня любіць самакрытыкі. Калі настаўнікі, правёўшы адпаведную работу з сялянамі-бедакамі і сераднякамі, хацелі выпусьціць насьценгазэту, дык тав. Майкевіч заявіў—«гэта ня справа настаўнікаў». Так газэта і ня выйшла.

А. Кажаноўскі.

У студзені 1931 г. у г. Слуцку адкрыліся 6-месячныя курсы па падрыхтоўцы рахункаводаў. Наркамфін дагэтуль не дасылае для курсаў падручнікаў, што адбіваецца на рабоце курсаў.

С. Рубцоў.

Ліст у рэдакцыю

У вымешчаным у вашай газэце ад 20-III—1931 г. у маім артыкуле **«Чыстка савецкага апарату—важнейшая задача» ўкралася прыкрая памылка,** у тым месцы дзе тав. Дукшт характарызуецца як шкоднік. Трэба чытаць **не Дукшт, а Надус,** які сапраўды зьяўляецца шкоднікам, і зараз арыштаваны. Аб ім і ішла путарка ў артыкуле.

З прывітаньнем Касьцюкевіч.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО
ЗПАНЯДЗЕЛКА 13-гаКРАСАВІКА

Кіно-тэатр „Культура“	Старац Васіль Гразноў Хроніка № 13 Пач.: 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса—з 5 гадз.
„Чырвоная Зорка“	ДЗЬВЕ СІЛЫ Гукавы фільм ПОШТА Пачатак а 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса адч. з 5 г.
Кіно інтэрнацыянал	2-гі тыдзень 2-гі тыдзень Гістарычны фільм ЛЕДЗЯНЫ ДОМ Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 г.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	2 фільма ў 1 сэанс. Пат і Паташон у лепшай камэдыі 1. Пачатак кар'еры у 7 час к. 2. Заможны паход у 2-х частк. Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 гадз.
Кіно „Юны Піянэр“	Кіно-п'еса ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ у 6 частк. Звыш праграмы хіно-хроніка № 16 Пачат. сэансу а 1 г. дню. Каса адч. з 11 г. 30 хв.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ

АПАВЯШЧАЕ,

што сёньня 18 красавіка роўна а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні канторы Дзяржбанку 2 паверх адбудзецца

чарговая сустрэча гаспадарнікаў плянавікоў і бухгальтароў з Дзяржбанкам.

АБВЕСТКА ДНЮ:

Даклады тав. Кузьнацова (прадстаўнік праўленьня Дзяржбанку) і Валоціна (галоўны бухгальтар канторы) па пытаньнях зьмен у крэдытнай раформе.

Запрашаюцца шэфы—рабочыя заводу „БАЛЬШАВІК“.

Усебеларуская кантора Дзяржбанку.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе 1-го дакуманту 1 руб.

ПАСТАНОВА НКП БССР І ВСНГ БССР
аб увядзеньні ў жыцьцё адзіных беларускіх рэспубліканскіх расцэнак НА БУДАЎНІЧЫЯ РАБОТЫ

№ 2—9 ад 8 красавіка 1931 г.

1. Увесьці ў жыцьцё з 1 мая 1931 г. на тэрыторыі БССР адзіныя Беларускія Рэспубліканскія расцэнкі на будаўнічыя работы распрацаваныя міжведамственнай камісіяй пры Будаб'яднаньні ВСНГ БССР.

2. Гэтыя расцэнкі зьяўляюцца абавязковымі для ужываньня на ўсе будаўнічыя работы, выконваныя ўсімі будаўнічымі арганізацыямі, усімі ведамственымі і гаспадарчымі органамі.

3. Парушэньне адзіных расцэнак цягне за сабой прыцягненьне да судовай адказнасьці.

4. Усім прафарганізацыям і аддзелам працы ставіцца ў абавязак прасачыць за ўжываньнем адзіных расцэнак.

За старшыню ВСНГ БССР член прэзыдыуму ДВАРЭЦКІ.
Нам. НКП БССР САЛАМОНАЎ.
За старшыню ЦСПСБ КАМЕНШТЭЙН.

АДЧЫНЕН ПРЫЁМ
у беларускую дзяржаўную школу сьляпых
(ст. Чырвоны-Бераг Зах. чыг.)

У школу прымаюцца дзеці з поўнай і нявылечнай сьлепатой на абодвы вокі, фізычна-здровыя і псыхічна нармальныя ў 1 групу ад 8-10 гадоў; дзеці ад 11 да 16 гадоў будуць залічацца у адпаведныя г. упы пасьля [illegible]

Заявы прымаюцца да 15 [illegible]

Неабходны наступныя дакументы: [illegible] аб узросце, [illegible] сьлепаці з абавязковым дадатковым даведкі [illegible] сухіх [illegible] воэра, 3) даведка аб занятках і маёмасным [illegible]

Дзеці ў школе знаходзяцца на [illegible] маньні, набываюць веды ў аб'ёме праграмы [illegible] цоўнай школы і вывучаюць шчотачнае, [illegible] рамесьніцтва.

Адміністрацыя.

ЗГУБЛЕНЫ:

Асабістая вайсковая кніжка на імя Дудалева М., выд. Жлобінскім РВК, кв. 137-п.

Асабістая вайсковая кніжка на імя Гольдзіна Б. Л., выд. 6-ым стралк. палк. у Менску, кв. 138-п.

Паявая кніжка № 3847, на імя Шагойка Ц. Е., выд. Бярэзінскім спаж. т-вам, кв. 139-п.

Асабістая вучотная кніжка на імя Леоненка Н. Ф., выд. Мсьціслаўскім РВК, нар. 1904 г., кв. 140-п.

Вайсковая кніжка на імя Шаванава [illegible] М., выд. Мсьціслаўскім ваенкаматам, кв. 141-п.

Вайсковая кніжка на імя Аўласенка [illegible] выд у г. Бабруйску, 23 стр. палк. 8 стралк. дыв., кв. 142-п.

Вайсковы білет на імя Дубейскоўскага, выд. Брэнскай 26 адда. ротай, кв. 143-п.

Вайсковая кніжка № 1768 на імя Алексеева Н., кв. 147-п.

Нарсуд Сьмілавіцкага раёну, згодна свайго прысуду ад 9 студзеня 1931 г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне памочніку начальніка станцыі Руднянск Якубовічу Міхасю Нічыпараву за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў 196-213 арт. Кр. Код., якія выявіліся ў тым, што ён 21-IX-30 г. будучы дзяжурным па станцыі прыняў багаж, але ў карэньчыку квіт ка не паказаў колькі месц прынята, на якую суму і месца прызначэньня.

Нарсуд Сьмілавіцкага раёну, згодна свайго прысуду ад 21-XII-30 г., на падставе 196 з дапасаваньнем 51 арт. Кр. Код., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні Апчацкага сельсавету Сьмілавіцкага раёну Петрыковічу Сьцяпану Яўхімаву за несваячасовую высылку належнай колькасьці фурманак для шашы Магілеў—Менск і тэхніку 2 вуч. IV дыстанцыі па пабудове шашы Магілеў—Менск, Брыжу Ільлюку Міхасёву за несваячасовую падачу вестак Апчацкаму сельсавету аб ходзе работы на шашы, нерэгаваньне на нявысылку сельсаветам фурманак і непрадастаўленьне работы для 17 фурманак высланых сельсаветам для работы на шашы.

Нарсуд Асіпавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 16 лютага 1931 году па арт. 196 Кр. Код з карнай санкцыяй арт. 213 Кр. Код., за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў (будучы членам Ясеньскага сельсавету атрымаўшы ад сельсавету нарады на трудгужпавіннасьць не даручыла свае часова сялянам, чым падарвала своячасовае выкананьне нарадаў на гужпавіннасьць) абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. вёскі Гранеўкі Канган Ганьне Рыгоравай.

Нарсуд Асіпавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 20 лютага 1931 году па арт. 196 Кр. Код. з карнай санкцыяй арт. 213 Кр. Код., за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў (будучы членам сельсавету, атрымаўшы прапанову склікаць сход вёскі і дапамагчы правесьці сход брыгадзіру па лесазагатоўках, склікаўшы сход не зьявіўся на яго), абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. вёскі Лапічы, Канонінку Міхасю Мікалаеву.

Нарсуд Круглянскага раёну, на падставе свайго прысуду ад 1-IV-31 г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне дзесятніку Цяцерынскага Вучлеспрамгасу Шайтанову Антону Антонаву за правышэньне ўлады (197, 213 арт. Крым. Код.).

Нарсуд Асіпавіцкага раёну, на падставе прыгавору ад 18 сакавіка 1931 году і арт. 213 Кр. Код., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну м. Асіпавічы Рудоміну Івану Іванаву за тое, што будучы кварткомам нядбайна адносіўся да прапаноў мес. савету аб высылцы людзей свайго кварталу, чым зрываў сьнега-барацьбу на станцыі Асіпавічы, што пагражала чыгуначнаму руху.

Народны суд Асіпавіцкага раёну, на падставе прыгавору ад 6-га сакавіка г. г. па арт. 213 КК., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне пр. м. Асіповічы Жданові Веры Пятровай за тое, што будучы сакратаром Асіпавіцкага райкалгасаюзу не прадставіла зьвестак у РВК аб пасеўкампаніі.

Нарсуд Камарынскага раёну, на падставе прысуду ад 14-га студзеня г. г. па арт. 196-195 ч. 2 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў гр-ну м. Камарына Галькевічу Яку Сьцяпанавічу.

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прысуду ад 31 студзеня 1931 г. па арт. 231 КК, за нядбайнасныя адносіны да працы абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. в. Голынкі Падруб. скаму Архіпу.

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прысуду па арт. 196-213 КК, за скарыстаньне службовага палажэньня абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні калгасу «Калініна» Карповічу Сьцяпану

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прысуду ад 6 сакавіка 1931 г. па арт. 196-213 КК, за нядбайныя адносіны да працы абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне паляводу калгасу «Пераможца» Яроцкаму Якубу В.

Нарсуд Бярэзінскага раёну, на падставе прысуду па арт. 196-213 КК, за нядбайныя адносіны да выканьня абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні калгасу імя Чарвякова Белавусу Вінцэлю Міхасёву.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, д. № 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
Падпісная плата 1 месяц—90 кап., 3 м-цы—2,70, 6 м-цаў—4,00 на год—8,00.

Галоўлітбел № 598. Друкарня імя тав. СТАЛІНА.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2